Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

№ 160 (3268) Серада, 17-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ВЕНА, 16. Орган незалежных баўгарскіх прафсаюзаў „Адзінства“ зноў прызывае рабочых, ня гледзячы на тэрор буржуазіі, фашысцкіх банд і сацыял-фашыстых, правесьці 1-га жніўня генэральную забастоўку і масавыя дэманстрацыі па ўсёй Баўгарыі

НАВІНЫ Д. У. У.

Ясьлі для дзяцей батрачак і беднаты

Наркамат аховы здароўя адпусьціў 1,000 руб. на арганізацыю дзіцячых ясьляў у Чэрвенскім раёне. У бліжэйшыя дні ясьлі будуць адкрыты ў адным з сельсаветаў раёну. Ясьлі разьлічаны на 30 дзяцей сялянскай беднаты і батрачак

ЗА ЛЕНІНСКУЮ ЗЬМЕНУ

Наша краіна — краіна сапраўднага сацыялістычнага будаўніцтва. Вялікі Кастрычнік выклікаў за сабой няўхільна рэвалюцыю ў эканоміцы, культуры, у попыце і зараз у краіне на кожным, нават, самым няпрыкметным, вучастку жыцьця адбываецца працэс рэвалюцыі —будаўніцтва новага, сацыялістычнага ладу, камуністычнага жыцьця. Камуністычны лад адну за другой адваёўвае пазыцыі ад старога, капіталістычнага, і нам, маладому пакаленьню Кастрычніка, усё больш і больш выразьней відны яскравыя мэты, да якіх вядзе працоўных наша партыя.

Працэс камуністычнай рэвалюцыі, камуністычнага будаўніцтва ня можа адбывацца без перадзелкі людзей, без працэсу фарміраваньня ў людзях камуністычнае псыхалёгіі, матэрыялістычнага сьветапогляду. Ад таго, як будзе адбывацца працэс фарміраваньня новых людзей, будзе залежаць затрымальне ці паскарэньне і працэсу сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта тым больш важна, што сацыялістычнае будаўніцтва адбываецца ў умовах напружаньня ўсіх сіл партыі, пралетарыяту і працоўнага сялянства над практычным ажыцьцяўленьнем пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры, у умовах абвастрэньня клясавае барацьбы ў нашай краіне.

Сацыялістычны паступ пралетарыяту на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі выклікае супраціўленьне з іх боку і абвастрэньне клясавай барацьбы ня толькі ў галіне эканомікі, палітыкі, культуры, і, асабліва, і ў галіне барацьбы за падрастаючыя пакаленьні, за ўплыў на іх. Нашы ворагі вельмі добра ўлічваюць значэньне таго, за кім пойдзе моладзь у надыходзячых бойках, за кім пойдуць падрастаючыя в дзяцей кадры моладзі, і робяць усё для ўзмацненьня свайго арганізацыйнага (сэктанты і інш.) ідэалёгічнага ўплыву на дзяцей.

Падрастаючыя пакаленьні павінны быць і будуць з камуністычнай рэвалюцыяй, яны павінны быць і будуць зьменай, вартай лепшых пралетараў нашай краіны, загінуўшых і згараючых у самаадданай рэвалюцыйнай барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва.

Гэта вымагае ад камсамолу, ад партыі ўпартай працы па камуністычным выхаваньні дзяцей, вялізарнай увагі дзецям.

У нас ёсьць камуністычная арганізацыя, яднаючая дзяцей працоўных, піянэрская арганізацыя. Яна за гады свайго існаваньня ў Беларусі набыла агромністы вопыт працы з дзяцьмі. Немалую долю складае ў ім вопыт удзелу піянэрарганізацыі ў грамадзкай працы — удзел у культпаходзе камсамолу, у перавыбарах сельсаветаў, у камсамольскім паходзе за ўраджай і калектывізацыю, у барацьбе за новую сапраўды працоўную школу, — якая (праца) выразьней ва ўсё сьведчыць аб камуністычнай сутнасьці дзіцячага руху ў нас, і якая сапраўды зьяўляецца адным в найлепшых мэтадаў камуністычнага выхаваньня дзяцей.

Але адданыя сацыялістычнаму будаўніцтву і барацьбе за яго, камуністычная партыя і пралетарыят нашай краіны вельмі мала аддаюць увагі справе падрыхтоўкі з дзяцей камуністычных рэзэрваў. Пытаньне камуністычнага выхаваньня дзяцеў у практычнай працы не заваявала яшчэ належнай увагі партарганізацый, рабочай клясы, усёй савецкай грамадзкасьці, што значна адбіваецца на дзіцячым руху, — малая колькасьць, цякучасьць, нязначная матар'яльная база, адсутнасьць, часта, месца для збору. Належная ўвага павінна быць аддадзена піянэрарганізацыі. Перад намі важнейшая задача зараз— сабраць вопыт піянэрарганізацыі ў адно, сыстэматызаваць яго і ўважліва прааналізаваць. З гэтай мэтай правадзяцца зараз раённыя зьлёты піянэрарганізацый Беларусі, і ў жніўні адбудзецца Ўсебеларускі і Ўсесаюзны зьлёты. Але піянэрзьлёты павінны быць ня толькі аглядам узрастаючых маладых рэзэрваў рэвалюцыі, вопыту іх працы, а і, галоўным чынам, аглядам таго, што зроблена партыяй, камсамолам, дзяржаўнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі ў справе падрыхтоўкі гэтых кадраў, яны павінны даць у выніку патрэбны зрух у справе дапамогі камуністычнаму дзіцячаму руху, у справе падрыхтоўкі вымены, бо зроблена намі ў гэтай справе зусім і зусім мала. У гэтым заключаецца вялізарнае палітычнае значэньне зьлётаў. Таму ні ў якім разе нельга дапусьціць, каб раённыя і Ўсебеларускі зьлёты ператвараліся толькі ў парад-паказ дасягненьняў піянэрарганізацыі і ў агляд іх з боку савецкіх, прафэсійных, партыйных і камсамольскіх арганізацый. Іменна таму, што мы любім дасягненьні піянэрарганізацыі, што яны нас радуюць, нам трэба прызнаць, як мала мы — партыя, камсамол, уся савецкая грамадзкасьць зрабілі для таго, каб гэтыя дасягненьні сталі ў шмат разоў большымі.

Часта, на жаль, у рабоце многіх арганізацый па дапамозе дзіцячаму руху, ёсьць факты недавучоты ўсёй палітычнай значнасьці піянэрарганізацыі, факты таго, што мы абмяжоўваемся фармальнай дапамогай дзіцячаму руху, адлічэньнем устаноўленых «процантаў», якія часамі складалі на ўвесь атрад пяцьдзесят кап. у месяц, факты, калі піянэратраду не даюць месца для збору. З такім становішчам трэба будзе пакончыць.

Выпікам такога становішча зьявілася і тое, што ў асобных раёнах партыйныя і іншыя арганізацыі адносьліся фармальна і да скліканьня раённых зьлётаў, не ўзьнялі ўвагі ўсіх членаў партыі, камсамолу, рабочых; і зьлёты, па сутнасьці, прайшлі толькі фармальна, ня даўшы патрэбных вынікаў; на зьлётах толькі былі самі піянэры ды камсамольцы, а іншыя арганізацыі абмяжоўваліся толькі прывітаньнямі на адчыненьні зьлёту. Гэта трывожны сыгнал, які трэба ацаніць як сьлед. Такіх фактаў можа быць больш. Есьць месцы, дзе падрыхтоўка да зьлёту ўскладзена цалкам толькі на штаб і, па сутнасьці, толькі на піянэрпрацаўнікоў, а іншыя арганізацыі, у тым ліку і камсамольскія камітэты, робяць зусім мала.

Падрыхтоўка і правядзеньне піянэрзьлётаў цавінна стаць справай усёй савецкай грамадзкасьці, шырокіх колаў партыі, рабочае клясы.

Неабходна ўсямерна дапамагчы зьлётам маладых ленінцаў.

П. ГАЛАВАЧ.

Вэрбальная нота СССР кітайскім уладам

КІТАЙСКІЯ БАНДЫТЫ НЯ СПЫНЯЮЦЬ СВАЕЙ ПРАВАКАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

Адмена паездкі тав. Серабракова ў Харбін

МАСКВА. 16-га ліпеня Наркам замежных спраў паслаў наступную вэрбальную ноту:

«У адказ на паведамленьне кітайскага пасольства ад 16-га гэтага ліпеня аб атрыманьні інструкцыі аб выдачы візы члену калегіі НКШЗ тав. Серабракову, наркам замежных спраў мае гонар паведаміць наступнае: з 12-га ліпеня, калі была падана заява аб выдачы візы тав. Серабракову, па сёньняшні дзень мелі месца новыя падзеі: захват кіраўніцтва К.-Усх. чыг., адхіленьне ад пасады і высылка кіраўніка К.-Усх. чыг. т. Емшанава і яго памочніка тав. Эйсмонта, закрыцьцё савецкіх устаноў у Манчжурыі, масавыя звальненьні з пасад, арышты і высылкі савецкіх грамадзян, рабочых і служачых К.-Усх. чыг. у зьвязку з усімі гэтымі падзеямі—нота саюзнага ўраду ад 13-га ліпеня г. г. З прычыны гэтага наркам замежных спраў распарадзіўся адкласьці паездку тав. Серабракова ў Харбін да атрыманьня адказу кітайскага ўраду на ноту саюзнага ўраду ад 13-га ліпеня г. г.».

***

МАСКВА, 15. Пашпарт члена калегіі НКШЗ тав. Серабракова быў перададзены кітайскаму пасольству 12 ліпеня г. г. Аднак, да вечара 15 ліпеня, кітайскае пасольства спасылаючыся на інструкцыі з Нанкіну не дало яшчэ візы на ўезд тав. Серабракова ў Кітай.

Далейшыя звальненьні савецкіх служачых

ХАБАРАЎСК, 15. 15-га ліпеня паліцыя наведала консульства СССР станцыі Пагранічнай, нібы, з мэтаю абсьледваньня радыё-устаноўкі для сувязі з далёкае адлегласьці. Сапраўды-ж яна зьявілася в мэтаю зрабіць вобыск. Паліцыя ня была дапушчана ў консульства, з прычыны чаго заявіла, што паведаміць аб гэтым ваеннае камандваньне. Усё гэта адбылося ў прысутнасьці дыпляматычнага камісара.

А 11 гадз. 10 хв. паліцыя акружыла савецкую мытню і спрабавала ўвайсьці ў памяшканьне апошняй, ламячыся ў дзьверы ,але ёй не адчынілі. Праз некаторы час зьявіўся кіраўнік мытні тав. Кузаўлеў для перагавораў, пасьля чаго паліцыя пайшла.

А 12 гадз. ночы 15-га ліпеня паліцыя зьявілася ў дзяжурнае памяшканьне мытні і нічога не зрабіўшы праз некаторы час пайшла.

15-га ліпеня ў Харбіне абвешчаны загад адміністрацыйнай часткі К.-Усх. чыг. аб звальненьні яшчэ 45 чалавек.

Заява старшыні генэральнага кангрэсу трэд'юніёнаў кітайскаму паверанаму

ЛЁНДАН, 15. Старшыня генэральнага кангрэсу трэд-юніёнаў Бэн Тылет разам з сакратаром англа-расійскага парляманцкага камітэту Коца сёньня наведаў паверанага ў справах Кітая ў Англіі ў кітайскім пасольстве, у зьвязку з падзеямі на Дальнім Усходзе.

У гутарцы з карэспандэнтам ТАСС Бэн Тылет паведаміў, што ён зазначыў кітайскаму паверанаму ў справах на недапушчальнасьць дзеяньняў кітайскіх улад. Бэн Тылет заявіў паверанаму, што савецка-кітайскія згоды, заключаныя ў 1924 г., прадугледжваюць спосабы мірнага ўрэгуляваньня ўсякіх спрэчак, але ўсё-ж кітайскія ўлады, відавочна, ігнаруюць гэтыя спосабы.

Падкрэсьліваючы, што агрэсыўнае выступленьне кітайскіх улад стварыла пагражаючае становішча, Бэн Тылет паказаў на ўзросшую небясьпеку вайны, адзначыўшы, што ў выпадку ўзьнікненьня вайны, у яе будуць уцягнуты некалькі дзяржаў. Бэн Тылет дадаў, што ўся адказнасьць за цяперашняе становішча ўскладаецца выключна на Кітай і што арганізаваныя ангельскія рабочыя ня могуць адчуваць сымпатый да кітайцаў, калі іх дзеяньні пацягнуць за сабою больш сур'ёзныя вынікі. Бэн Тылет далей напомніў паверанаму ў справах, што ён быў актыўным прыхільнікам Кітая, актыўна працуючы ў камітэце «Рукі прэч ад Кітаю» і што гэта акалічнасьць яшчэ больш прымушае яго шкадаваць аб тым, што Кітай у сваіх адносінах з СССР цяпер ужывае імпэрыялістычныя мэтады, якія яшчэ нядаўна ўжываліся ў адносінах да самога Кітая.

Заява Бэн Тылета зрабіла, відавочна, вялікае ўражаньне на кітайскага паверанага ў справах і ён абяцаў неадкладна паведаміць яе зьмест свайму ўраду. У той-жа час ён папрасіў Бэн Тылета ня ўжываць ніякіх крокаў да атрыманьня ім адказу.

Японія спыніла продаж білетаў ў Эўропу праз К.-Усх. чыгунку

ТОКІЁ, 16. Паводле паведамленьня газэты «Токіё Асахі» японскае міністэрства чыгунак, учора паведаміла праўленьні карэйскай і паўднёва-манчжурскай чыгунак, а таксама ўсе пароходныя кампаніі аб неабходнасьці прыпыненьня продажу білетаў у Эўропу праз К.-Усх. чыгунку.

БУРНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПРАТЭСТУ Ў БЭРЛІНЕ

Усе вокны ў будынку кітайскага консульства разьбіты

БЭРЛІН, 16. Як паведамляе «Ротэ Фанэ» учора ўвечары перад будынкам кітайскага консульства ў Бэрліне адбылася дэманстрацыя пратэсту бэрлінскіх рабочых супроць правакацыйнага выступленьня кітайскіх улад на К.-Усх. чыгунцы. Пасьля выклічаў абурэньня дзеяньнямі кітайскага ўраду, паляцелі каменьні і **ўсе вокны ў будынку консульства былі разьбіты нашчэнт.** Дэманстрацыя скончылася яшчэ да прыбыцьця паліцэйскага атраду высланага для аховы консульства.

Адозва генэральнага сакратарыяту антыімпэрыялістычнай лігі

БЭРЛІН, 15. Генэральны сакратарыят антыімпэрыялістычнай лігі ў зьвязку з падзеямі на Кітайска-Усходняй чыгунцы перадаў друку адозву, у якой гаворыцца:

«Мы абвінавачваем у сьвядомай правакацыі вайны супроць СССР нанкінскі ўрад. У гэты важны момант мы заклікаем усе сэкцыі лігі барацьбы супроць імпэрыялізму, рабочых і сялянскія арганізацыі, якія далучаюцца да яе, згуртаваць свае рады для адзінага міжнароднага выступленьня.

«Рукі прэч ад СССР!»

«Прэч правакатараў злачынства, якое завецца вайной!»

Адначасова генэральны сакратарыят антыімпэрыялістычнай лігі зьвярнуўся з адозвае да ангельскіх і індыйскіх прафсаюзаў, якія належаць да лігі і да індыйскага нацыянальнага кангрэсу.

Заява прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў

ТОКІЁ, 15. Прадстаўнік японскага міністэрства замежных спраў у інтэрв'ю з карэспандэнтам ТАСС катэгарычна адхіліў чуткі нібы японскі ўрад думае зьвярнуцца да Лігі Нацый у зьвязку з канфліктам на К.-Усх. чыг. Прадстаўнік міністэрства замежных спраў дадаў, што гэта справа ў цяперашні час датычыць толькі СССР і Кітая і ніякі трэці бок ня мае ніякіх падстаў умешвацца ў канфлікт.

Замежны друк аб падзеях на Д. Усходзе

ПАРЫЖ, 13. Францускі друк аддае вялікую ўвагу савецка-кітайскаму канфлікту, публікуючы падрабязную інфармацыю аб харбінскіх падзеях. Орган радыкал-сацыялістых «Рэпюблік» рашуча асуджаючы захват К.-Усх. чыгункі кітайскімі ўладамі, паказвае, што антысавецкая палітыка нацыянальнага ўраду пачала праяўляцца з моманту заключэньня згоды паміж нацыянальным і ангельскім урадам, які вядзе «пад прыхільнымі ўзрокамі» Японіі шырокае наступленьне на СССР у Кітаі, Афганістане, Пэрсіі і па ўсёй Азіі.

***

ШАНХАЙ, 15. «Норд Чайна Дэйлі Ньюс» друкуючы савецкую ноту з поваду захвату К.-Усх. чыгункі піша:

«Няма сумненьняў, што харбінскія падзеі адбыліся бяз ведама і згоды нанкінскага ўраду, якому цяпер прыходзіцца шукаць формулу, каб ўпарадкаваць становішча, якое можа мець вельмі істотныя, а можа быць і вельмі страшныя вынікі. Кітайцы даўно мараць аб захвацe К.-Усх. чыг., бо кітайцы ўпэўнены ў тым, што СССР не адважыцца зьвярнуцца да рэпрэсій і не пашле свае войскі ў Манчжурыю, баючыся Японіі».

***

Камэнтары японскай прэсы сёньня характарызуюцца рэзкім асуджэньнем незаконных дзеяньняў кітайскіх улад. Газэты радзяць Кітаю прыняць прапанову СССР у мэтах мірнага вырашэньня канфлікту. Газэты публікуюць паведамленьні з Кітаю, у якіх гаворыцца, што нанкінскі ўрад адносіцца да ўльтыматуму савецкага ўраду вельмі аптымістычна і зусім ня мае намеру даць адказ у працягу трох дзён, прадугледжаных нотай.

Паводле аднэй вэрсіі ў Нанкіне адбылася нарада службовых асоб міністэрства замежных спраў, на якой пастаноўлена запрапанаваць Чан Кай-шы працягваць сучасную палітыку, бо ўльтыматум савецкага ўраду пустая пагроза. Паводле другой вэрсіі міністэрства замежных спраў мае намер распрацаваць адказ на ўльтыматум, у якім будзе паказана, што К.-Усх. чыг. захвачана ў мэтах абароны Кітаю ад чырвонай прапаганды. Пры гэтым у адказе будзе выказана згода нацыянальнага ўраду на перагаворы. Большасьць газэт пераконаны ў тым, што больш праўдападобнай зьяўляецца першая вэрсія. Друк у большасьці мяркуе, што толькі самыя энэргічныя меры з боку савецкага ўраду пазбавяць К.-Усх. чыг. ад ролі аб'екту агульнай палітыкі.

«Токіё Асахі» і «Хоці» публікуюць паведамленьні з Харбіну, у якіх гаворыцца, што «мэта ўльтыматуму савецкага ўраду» прымусіць Японію ўмяшацца ў канфлікт у якасьці пасярэдніка.

Ад народнага камісарыяту замежных спраў

(Начное радыё

МАСКВА, 16. Кітайскі ўпоўнаважаны ў Маскве Ся Вэн-сун учора, каля 6-ці гадз. увечары, паведаміў НКЗС аб наступнай тэлеграфнай інструкцыі, атрыманай ім ад міністэрства замежных спраў кітайскай рэспублікі ў Нанкіне.

Зьмяшчаем тэкст інструкцыі поўнасьцю:

— Хоць яшчэ ня ўся тэлеграма атрымана намі, якая зьмяшчае ў сабе пратэст савецкага НКЗС, патрабуючы адказу да вызначанага тэрміну, усё-ж галоўная думка ўжо зразумела. Звычайна наш урад прытрымліваецца спрыяючых адносін да СССР. Аднак, на гэты раз харбінскія падзеі выклікалі неабходнасьць прыняць цяперашнія меры ў адносінах КУЧ, але яны ня могуць уплываць на існуючыя цяпер дыпляматычныя адносіны дзьвюх дзяржаў. Пасланьнік Су Шао-ян хутка вернецца на месца службы. Калі-б савецкі ўрад меў якую небудзь думку, то можна хутчэй-жа прыступіць да двухбаковага шчырага абмеркаваньня яго.

Па нашай думцы, усе справы павінны вырашацца на аснове існуючых суадносін дзьвёх дзяржаў і абмяркоўвацца фактычна сумесна адзіэй з другою. Пры такой умове пытаньні лёгка вырашацца. Загадваем вам раней вусна паведаміць аб гэтым савецкі НКЗС і дадаць, што намі будзе безадкладна дан адказ, як толькі атрымаецца ўвесь зьмест пратэста НКЗС. Вай-Цзяо-Бу (міністэрства замежных спраў). 16 ліпеня 29 году.

УВАГА ТАСС. Па атрыманых ТАСС'ам з аўтарытэтных крыніц весткаx, саюзны ўрад ня зьбіраецца адказваць на гэта паведамленьне кітайскага міністэрства замежных спраў і чакае адказу кітайскага ўраду на ноту НКЗС ад 13-га ліпеня. Адказ гэты нанкінскае міністэрства замежных спраў абяцае даць, згодна яго паведамленьня безадкладна па атрыманьні ўсяго тэксту ноты.

БЕЛЫ ТЭРОР У ПОЛЬШЧЫ

Замах на жыцьцё 2-х дэпутатаў беларускага сялянска-работніцкага клюбу

ВАРШАВА, 13. Тут атрыманы весткі, што дэпутаты беларускага сялянска-работніцкага клюбу (фракцыя) сойму Гаўрылюк і Крынчук паранены стрэламі з рэвальвэру на мітынгу ў беларускім мястэчку Карэвічы. На мітынг напалі паліцэйскія і патаемныя агенты ў цывільным адзеньні. Падрабязнасьці замаху на жыцьцё беларускіх дэпутатаў яшчэ не атрыманы.

***

У апошнія часы наглядаюцца ўсё больш частыя выпадкі дзікай, агіднай расправы польская фашызму над ненавіснымі яму рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі.

Польскі фашызм, які шалёным тэмпам рыхтуецца да ўзброенага нападу на СССР, шляхам проста нячуванага тэрору стараецца задушыць нацыянальна-рэвалюцыйны рух працоўных мас Зах. Беларусі. Для дасягненьня гэтай сваёй мэты фашызму ўжо мала масавых арыштаў, мала катаваньняў па дэфэнзывах і 15-ці гадовых катаржных прысудаў над рабочымі і сялянамі. Для стэрарызаваньня працоўных мас, для задушэньня гэтага руху польскі фашызм, як ня раз ужо адзначалася нашым друкам, пачаў зьвяртацца да скрытага забойства сваіх ахвяр. (Забойства рабочага Пляка Юлека, селяніна Флёрыка, Кёнігсбэрга і інш.).

Зьмешчаная вышэй радыё-тэлеграма сьведчыць аб новых актах фашысцкага тэрору у Зах. Беларусі. Сярод белага дня агэнты польскага фашызму зрабілі замах на жыцьцё дэпутатаў беларускага сялянска-работніцкага клюбу — Гаўрылюка і Крынчука, якія прыехалі ў м. Карэвічы для справаздачы аб сваёй рабоце перад выбаршчыкамі. Пакуль што падрабязнасьцяй аб гэтым бандыцкім замаху агентаў польскага фашызму мы ня маем. Вядома толькі, што дэпутаты паранены рэвальвэрнымі стрэламі.

Гэты факт выразна паказвае, што польскі фашызм адкрыта ўжо без маскіроўкі пры дапамозе куль стараецца расправіцца з ненавіснымі яму прадстаўнікамі беларускіх працоўных мас, стараецца рэвальвэрамі закрыць рот працоўным масам, скрыць ад іх праўду аб сапраўдных прычынах голаду, аб тэй дзікай эксплёатацыі, якая вядзецца абшарнікамі і кулакамі на голадзе беларускіх працоўных мас, нарэшце скрыць свае падрыхтаваньні да вайны. Адначасова польскі фашызм пры дапамозе нячуванага тэрору стараецца палегчыць работу беларускім нацыянал-згодніканм Луцкевічам, Ярэмічам, Станкевічам і інш.

Але, дарэмныя ўсе фашысцкія патугі. Тэрорам нацыянальна-рэвалюцыйнага руху беларускіх працоўных мас ня спыніць. Адкрыты-ж замах на жыцьцё дэпутатаў — прадстаўнікоў працоўных мас толькі лішні раз пакажа працоўным, хто зьяўляецца сапраўдным іх абаронцаю, выкліча яшчэ большую нянавісьць як да фашызму, так і да яго прыхваснікаў беларускіх згодніканў. Гэты бандыцкі замах, як і два з лішкаю гады таму назад напад агентаў фашызму на дэпутатаў-грамадаўцаў у Старых Бярозах, ня толькі не запалохае працоўныя масы, але паспрыяе сыгналам да яшчэ больш цеснага аб'яднаньня працоўных вакол сваіх прадстаўнікоў—дэпутатаў з сялянска-работніцкага клюбу, да больш актыўнай барацьбы з фашызмам за сваё канчатковае вызваленьне з пад польска-панскага ярма.

С. Ж.

ПРАВАЛ ВАРШАЎСКАГА ЗЬЕЗДУ ЗАКАРДОННЫХ ПАЛЯКАЎ

Непаразуменьні сярод дэлегацый

Пастанова аб'яднанай дэлегацыі польскага працоўнага насельніцтва СССР

ВАРШАВА, 15. Учора, у залі пасяджэньняў сойму адкрыўся зьезд заўрубежных палякаў. Заля ўпрыгожана сьцягамі ўсіх дзяржаў, адкуль прыбылі дэлегаты. Дэманстрацыйна пакінуты месцы, на якіх вывешаны плякаты, што гэтыя месцы пакінуты былі для дэлегатаў СССР і Літвы.

На адкрыцьцё зьезду прыбыў прэзыдэнт Масьціцкі. Адкрыцьцё зьезду прайшло без усякага энтузіязму. Выклікана гэта **спрэчкамі ўнутры дэлегацый. З прычыны гэтых спрэчак рад арганізацый адмовіўся ўдзельнічаць у зьезьдзе.** Так, ня прыбыла на зьезд нацыянал - дэмакратычная частка дэлегацыі з Амэрыкі. Адсутнічае таксама частка бэльгійскай дэлегацыі.

Адкрыцьцё не абыйшлося без інцыдэнтаў. Адкрываючы зьезд, старшыня сэнату, ён-жа старшыня арганізацыйнага камітэту зьезду Шыманскі зрабіў вострую заўвагу па адрасу амэрыканскіх дэлегатаў, якія ня прыбылі на зьезд. Выклік быў прыняты кардыналам Хлондам, які ў сваёй прамове зрабіў рад нядвухсэнсоўных намёкаў па адрасу Шыманскага.

Эндэцкі друк адкрыта піша, што ўжо на першым пасяджэньні зьезду заўрубежных палякаў выявіліся супярэчнасьці. **Нават блізкая да ўраду прэса ня ўтойвае правалу зьезду.**

«Кур'ер Паранны» паказвае ў перадавіцы, прысьвечанай зьезду, што зьезд ня можа прэтэндаваць на поўнае прадстаўніцтва ўсіх палякаў, што жывуць за рубяжом.

Тое-ж самае адзначае і орган ППС «Роботник». На зьезьдзе аказалася немагчымым ухіліцца барацьбы пілсудчыкаў і іх праціўнікаў, што прымусіла арганізатараў зьезду змазаць праграму і перанесьці ўсю работу ў камісіі.

Акрамя пленарнага пасяджэньня, якое адбылося учора і на якім былі заслуханы даклады аб эканамічным ста-новішчы Польшчы і аб становішчы польскай эміграцыі, адбудзецца яшчэ ўсяго адно пленарнае пасяджэньне для галасаваньня рэзалюцый, прынятых у камісіях.

Шыманскі ў сваёй прывітальнай прамове закрануў пытаньне аб адсутных дэлегатах.

«Мы, — сказаў Шыманскі, — адхілілі прыезд дэлегацыі з СССР. Мы не маглі дапусьціць, каб трыбуна зьезду была скарыстана для бальшавіцкай прапаганды, як аб гэтым паведамлялі савецкія газэты, што выдаюцца на польскай мове. **Мы лічылі прыезд гэтай дэлегацыі лішнім з прычыны яе заявы аб тым, што яна лічыць СССР сваёй бацькаўшчынай».**

Выступіўшы ад імя ўраду міністар юстыцыі Цар заявіў, што польскі ўрад вітае ўсіх дэлегатаў зьезду незалежна ад іх палітычных перакананьняў. На зьезьдзе будзе абрана пастаянная бюро для сувязі в зарубежнымі палякамі. Вакол складу бюро ідзе лютая барацьба, якая таксама як і барацьба на самым зьезьдзе, дакладна маскуецца і адбываецца ў кулуарах. Варшава правяла надзвычайна нязначную зацікаўленасьць да зьезду.

Тэлеграма дэлегацыі СССР прэзыдыуму кангрэсу

КІЕЎ, 15. Адбылося другое пасяджэньне дэлегатаў аб'яднанай дэлегацыі польскага працоўнага насельніцтва СССР. З прычыны таго, што арганізацыйны камітэт варшаўскага кангрэсу не адказаў на тэлеграму, пасланую яму аб'яднанай дэлегацыяй, дэлегацыя пастанавіла зьвярнуцца з тэлеграмай да прэзыдыуму кангрэсу зарубежных палякаў і да ўсіх удзельнікаў кангрэсу.

***

Да эўрапэйскага пералёту савецкага самалёту „Крыльлі Саветаў“

НА ЗДЫМКУ: самалёт „Крыльлі Саветаў“ на аэрадроме па прыбыцьці ў Бэрлін.

Пратэст працоўных СССР супроць кітайскай ваеншчыны

УДАРЫЦЬ ПА РУКАХ ЗАРВАЎШЫХСЯ МІЛІТАРЫСТЫХ

У ПАРКУ КУЛЬТУРЫ І АДПАЧЫНКУ

МАСКВА, 15. Адразу-ж пасьля сканчэньня работ і лятучых мітынгаў на прадпрыемствах рабочыя Масквы накіраваліся магутнай дэманстрацыяй пратэсту да кітайскага пасольства. Над калёнамі стрыкаталі насьпех напісаныя рашучыя лёзунгі, якія заклікалі да неадкладнага адпору кітайскім контр-рэвалюцыянэрам. «Няхай жыве адзінства працоўных СССР і Кітаю», «Усе, як адзін, на абарону заваёў Кастрычніка», «Патрабуем ад ураду ўдарыць па руках абнаглеўшых кітайскіх белабандытаў»!

Ціхі Крапоткінскі завулак, у якім знаходзіцца асабняк кітайскага пасольства, яшчэ ніколі ня бачыў такой абуранай чалавечай лавіны, якая перапоўніла яго ўчора. «Рукі прэч ад Савецкага Саюзу!» Далоў правакатараў новай вайны!—крыкнуў адзін з дэманстрантаў. «Далоў»!!—падхапіла рэшта і паветра прарэзаў дружны сьвіст, ад якога пагражаюча задрыжалі вокны пасольства.

Пад напіскам задніх радоў дэманстранты наваліліся на конную міліцыю, якая ахоўвала браму. За плот пасольскага асабняку паляцелі агрызкі аблык. У гэты час пачуўся крык: «Таварышы, нас ня ўдасцца справакаваць на вайну. Калі трэба будзе, мы давядзем сваю здольнасьць заваяваць і перамагаць ня тут, а на граніцах СССР».

А 5 з палов. гадзін пачаўся лівень, але калёны не парадзелі. Бадзёра праходзілі яны, заглушаючы шум дажджу лёзунгамі і сьпевамі. Раптам з Астожанкі, адкуль праходзілі калёны, пачуліся гучныя воплескі, якія ня спыняліся да таго часу, пакуль міма пасольства не прайшлі студэнты камуністычнага ўніверсытэту працоўных Кітая. Адзін з іх зьвярнуўся да дэманстрантаў з прамоваю на кітайскай мове. Наўрад ці хто зразумеў яго прамову, але заражаныя пачуцьцём міжнародный пралетарскай салідарнасьці, рабочыя віталі яго доўгімі крыкамі «ура».

«Калі кітайскія агенты сусьветнага капіталу даб'юцца імпэрыялістычнай вайны, то рабочыя ўсяго сьвету абярнуць гэтую вайну ў грамадзянскую»,— напісалі на сваім плякаце рабочыя заводу «АМО». У працэсу 5-ці гадзін на завулку кацілася суцэльная лавіна дэманстрантаў. Паасобныя калёны праходзілі да позьняга вечара.

Учарайшая дэманстрацыя паказала, што сярод працоўных СССР няма ніводнага, які-бы па першым закліку ўраду і партыі не пашоў-бы на абарону СССР.

***

Лятучыя мітынгі, прысьвечаныя падзеям на К.-Усх. чыгунцы адбыліся ў Кіеве, Харкаве, Днепрапятроўску, Луганску, Новасібірску, Баку і інш. гарадох Савецкага Саюзу. Усюды ў шматлікіх рэзалюцыях рабочыя выказваюць абурэньне з поваду правакацыйных дзеяньняў кітайскіх улад і **патрабуюць ад саюзнага ўраду ўжыцьця рашучых мер супроць абнаглеўшых бандытаў.** Рабочыя ў адзін голас заяўляюць: мы вайны ня хочам, але ўсе, як адзін станем на абарону Саюзу Савецкіх рэспублік. **Рабочыя-будаўнікі ў Луганску пастанавілі адлічыць паўдзенны заработак на пабудову—«Эскадрыльлі імя 1-га жніўня».**

Рабочыя менску гатовы да абароны СССР

Рабочыя, работніцы і служачыя дзярждрукарні БДВ горача пратэстуюць супроць гэтага наглага налёту, супроць гэтай наглай правакацыі сусьветных імпэрыялістых, зробленай з мэтаю выклікаць СССР на вайну і гэтым самым задушыць савецкую краіну.

Патрабуем, каб наш урад прыняў самыя рашучыя меры супроць кітайскіх бандытаў - захватчыкаў.

Патрабуем убраць войска з нашых савецкіх граніц. Убраць белагвардзейцаў і ўстанавіць савецкіх работнікаў чыгункі.

Заяўляем, што мы ўсе, як адзін, са зброяй у руках, гатовы абараняць нашу сацыялістычную бацькаўшчыну, калі гэта будзе патрэбна.

***

Рабочыя і служачыя ст. Менск, пасажырская, поўнасьцю ўхваляюць ноту савецкага ўраду, якая зьяўляецца лепшым довадам непахістнасьці палітыкі міру, якая праводзіцца нашай сацыялістычнай дзяржавай. Мы супроць вайны. Але калі хто адважыцца перашкаджаць нашаму разгорнутаму сацыялістычнаму будаўніцтву, **мы станем стальной сьцяной на абарону нашае сацыялістычнае бацькаўшчыны.**

***

Рабочыя і работніцы працкалектыву «Утылізацыя» выказваюць свой пратэст і запэўніваюць, што ў патрэбны момант гатовы выступіць на абарону інтарэсаў Савецкага Саюзу.

***

Мы, **рабочыя шавецкай майстэрні Гандальбуду** катэгарычна пратэстуем супроць спроб кітайскай ваеншчыны і яе натхніцеляў — сусьветнага імпэрыялізму выклікаць СССР, першую краіну дыктатуры пралетарыяту, на вайну з мэтаю сарваць наша пераможнае будаўніцтва сацыялізму і вадушыць Савецкі Саюз — аплот сусьветнай рэвалюцыі.

У адказ на наглы выклік, яшчэ **больш згуртуем свае рады вакол ленінскай партыі, даб'емся правядзеньня ў жыцьцё пяцігадовага пляну нашае гаспадаркі.**

Мы патрабуем неадкладнага ўводу войск з нашай граніцы. Мы патрабуем вызваленьня арыштаваных грамадзян СССР.

Мы патрабуем неадкладнага аднаўленьня нашых прадстаўніцтваў і рабочых арганізацый.

Вуздавы сход рабочых і служачых ст. Менск-таварн. М.В.Б. чыг. канстатуе, што гэты налёт, зроблены рукамі Кітайскае ваеншчыны, арганізаваны сусьветным капіталам, каб справакаваць СССР на вайну.

Мы — рабочыя і служачыя ст. Менск-таварн. М.В.Б. чыг. рашуча пратэстуем супроць наглых выпадкаў кітайскай улады і сусьветнага капіталу.

Мы ўпэўнены, што Савецкая ўлада знойдзьдзе меры, каб раз назаўсёды пакласьці канец падобным актам кітайскіх бандытаў і заяўляем, што па першаму закліку Камуністычнае партыі і Савецкае ўлады, як адзін выступім на абарону Савецкага Саюзу.

У адказ на выпадкі сусьветнай буржуазіі мы яшчэ больш узмацнім падняцьце вытворчасьці працы і тэмп індустрыялізацыі нашай краіны.

Прыезд амэрыканскай эканамічнай дэлегацыі ў СССР

(Па тэлефону ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

**НЕГАРЭЛАЕ, 16. А 8-ай гадзіне ўвечары з спэцыяльным экспрэсам з Бэрліну прыехала амэрыканская эканамічная дэлегацыя ў складзе 87 чалавек. Сярод праехаўшых: 40 прадстаўнікоў

„Ня трэба сварыцца з кулаком“

Парушэньні партыйнай лініі пры перавыбарах сельгаскаапэрацыі ў Полаччыне

Недаацэнка ролі беднаты на вёсцы

Сацыялістычнае наступленьне пралетарыяту выклікае зараз рост актыўнага супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, абвастрэньне клясавае барацьбы.

Гэта абавязвае ўсе партыйныя, прафэсіянальныя і каапэрацыйныя арганізацыі рашуча змагацца з дробна-буржуазнымі хістаньнямі, шырока арганізаваць батрацтва і беднату для наступленьня на кулака.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія па сыстэме сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі Полаччыны выявіла рад момантаў хвасьцізму, недаацэнкі ролі беднаты ў вёсцы, адшуканьня новых няправільных мэтадаў працы на вёсцы, як скліканьне паасобных сходаў сераднятства.

Так, напрыклад, Вобальская ячэйка КП(б)Б абгаварвала на сходах беднаты кандыдатуры ў склад праўленьня крэдытнага т-ва і рэкамэндавала іх зьезду ўпаўнаважаных. Пасьля выступленьня некаторых заможнікаў, ячэйка зьняла сьпіс, матывуючы гэта прынцыпамі захаваньня «шырокай дэмакратыі». Кандыдатуры высоўвалісь заможнікамі, а пасьля ўжо беднякамі-адзіночкамі. Такім чынам быў затушаваны палітычны твар ячэйкі, як авангарду.

Праводзіўся зьезд упаўнаважаных Хоцінскага таварыства, дзе ранейшы склад праўленьня крэдытаваў кулацкія элемэнты вёскі, дзе асабліва востра адчуваецца клясавая барацьба. Прадстаўнік сельбанку, стары партыец, на запытаньне сакратара ячэйкі, ці трэба правесьці перад выбарамі сход беднаты, адказаў: «ня трэба, а то яшчэ пасварацца».

А вось новыя «мэтады» працы на вёсцы. Пры правядзеньні выбараў Росіцкага таварыства, прадстаўнік райкому (старшыня РВК) даў устаноўку, каб кандыдатуры ў кіруючыя органы т-ва былі абгаворваны і сярод сераднякоў. Гэтая практыка была перанята і Асьвейскім таварыствам.

Такім чынам роўналежна праходзілі два сходы. На сходзе сераднякоў абгаварваліся кандыдатуры, не абгавораныя папярэдня на сходзе беднаты. Што было-б, калі сераднятства, ізаляванае ад нашае апоры на вёсцы—батрацтва і беднякоў, пад уплывам кулацтва, не згадзілася-б з кандыдатурамі, прапанаванымі парт'ячэйкай, а высунула-б свае кандыдатуры; калі-б сход беднаты, пры абгаварэньні кандыдатур, унёс-бы некаторыя зьмены, а сераднятства не згадзілася-б з імі? Цікава, якую пазіцыю заняла-б тады парт'ячэйка?

Перш-наперш, трэба заўважыць, што правядзеньне спэцыяльных сходаў сераднятства не адпавядае клясавай лініі партыі і апашляе лёзунг—«Апора на бедняка, саюз з сераднятвам і наступленьне на кулацтва»

Трэба цьвёрда памятаць, што на вёсцы зараз мы маем барацьбу сацыялістычных і капіталістычных элемэнтаў за асноўную масу сялянскіх гаспадарак.

Тав. **Сталін** у кніжцы «Пытаньні і адказы», між іншым адзначае: «Таму мы ня можам займацца палітыкай зьмякчэньня барацьбы. Наша задача ў тым, каб арганізаваць барацьбу беднаты і кіраваць гэтай барацьбой супроць кулацтва».

Тав. **Кагановіч** у сваім артыкуле «Палітычныя задачы кампаніі перавыбараў у саветы» таксама падкрэсьліў: «Трэба перш за ўсё ўзмацніць арганізацыю беднаты і тым самым узмацніць пазыцыю беднаты і асабліва батрацтва.

Гэта не павінна, зразумела, прывесьці да адштурхваньня серадняка. Лінія наступленьня на кулака павінна прывесьці не да паслабленьня, а да ўзмацненьня нашых сувязяй з серадняком».

Таму спэцыяльныя сходы сераднякоў, ізаляваныя ад уплыву батрацтва і беднаты, ня могуць зьяўляцца сродкам, які стымулюе барацьбу за серадняка. Толькі сходы беднаты, пад ідэёвым кіраўніцтвам партыі, пры ўдзеле сераднякцкага савецкі настроенага актыву, змогуць служыць клясавай зброяй барацьбы за **«цэнтральную фігуру вёскі»**.

П. АНУЧЫН.
С. ЦЭНЦЫПЭР.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА І ЧЫСТКА ВЯСКОВЫХ ЯЧЭЕК КП(б)Б

ПАКАЗАЛА, ШТО НЕКАТОРЫЯ З ІХ У ЗНАЧНАЙ СТУПЕНІ ЗАСЬМЕЧАНЫ САЦЫЯЛЬНА-ЧУЖЫМІ КУЛАЦКІМІ ЭЛЕМЭНТАМІ

У радзе ячэек праверкомы выкрылі факты скажэньня клясавай лініі, разлажэньня і недапушчальнай бязьдзейнасьці

Батракі і сяляне беднякі падаюць заявы аб уступленьні ў партыю

ЧЫСТКА ЎЗЬНЯЛА АЎТАРЫТЭТ ЯЧЭЕК

(Менская акр.)

Пяць ячэяк **Чэрвенскага раёну** прайшло праверку, што дае магчымасьць у некаторай ступені абагуліць работу па чыстцы.

Работа камісіі праходзіла пры шырокім і актыўным удзеле працоўных мас на працягу усяго пэрыяду.

Чужыя, антысавецкія элемэнты (аб гэтым у свой час «Зьвязда» пісала) спрабавалі выкарыстаць чыстку у сваіх інтарэсах, для дыскрэдытацыі вытрыманых камуністых. Пазбаўленыя выбарчых правоў, кулакі і падкулачнікі, спэкулянты, былыя паліцэйскія пралазілі на праверачныя сходы, узводзілі паклёпы на сапраўды вытрыманых камуністых, але тут-жа выкрываліся і выстаўляліся са сходаў.

Так, пры праверцы саўгаснай **Рудня-Астравіцкай** ячэйкі, на сход прышлі чарадою кулакі і падкулачнікі. Яны пры праверцы партыйца **Калтовіча**, былога старшыні сельсавету, выступілі з радам абвінавачваньняў на гэтага таварыша. Кулакі і падкулачнікі выступалі адзін за другім. Яны да гэтага падрыхтаваліся, зьбіраліся на нараду, спрабавалі агітаваць беднату. За некалькі дзён да чысткі кулакі паслалі сваю групу ў горад у камісію з скаргамі на **Калтовіча**. Выяўлена, што гэта група сыстэматычна падрывала правядзеньне мерапрыемстваў партыі на вёсцы, што гэтыя кулакі завялі да 16 фальшывых спраў у судовых органах на тав. **Калтовіча**.

Камісія пры актыўнай дапамозе партыйных мас і беднаты выкрыла гэту кулацкую групу і дала ёй належны адпор.

Жорстка падышла камісія да тых «камуністых», якія мелі сувязь з кулацтвам, не парвалі з рэлігіяй, бралі хабары і г. д.

Грабенская ячэйка складаецца з пяці партыйцаў, з іх трое выключаны з партыі. Выключаныя—**Крук Янка і Крук Сьцяпан**—абодвы працавалі ў сельсавеце, скажалі клясавую лінію, выконвалі рэлігійныя абрады і ў свой час накрывалі бандытаў. Крук Янка, працуючы ў арцелі дрэвапрацоўпчыкаў, даваў хлусьлівыя весткі Райкому аб сацыяльным складзе членаў арцелі.

Ніканчык—заможны серадняк, кандыдат КП(б)Б з 1921 году. будучы старшынёй сельсавету, абараняў кулака **Шабуню** ад абрэзкі. Пасьля земляўпарадкаваньня, кулакоў пакідаў жыць на месцы, а беднату высяляў на новыя сядзібы.

У іншых ячэйках раёну таксама выяўлены рад такіх асоб, якія ня могуць быць у партыі. Вось напрыклад: **Шамецька**, які працуе загадчыкам земчасткі РВК. Ён быў абраны кандыдатам у члены РК КП(б). **Шамецька** зьвязаўся з мяшчанствам, сыстэматычна п'янстваваў, маральна разлажыўся, у практычнай рабоце скажаў партыйную лінію, ня чула адносіўся да бядняцкай часткі сялянства, браў хабары.

Альбо **Аношка** — рабочы фабрыкі «Праца», мае сваю індывідуальную сельскую гаспадарку, у якой налічваецца 5 дзесяцін зямлі. На прапанову камісіі здаць зямлю ў запасны фонд і пайсьці працаваць у калгас,—адказаў адмоўна. Ён прысвоіў грошы аднае работніцы.

Праверка і чыстка райпартарганізацыі ўстанавіла цэлы рад момантаў неразуменьня партыйцамі генэральнай лініі партыі Палітычны ўзровень партыйцаў зусім нізкі, на самыя элемэнтарныя пытаньні цэлы рад партыйцаў, нават адказных раённых працаўнікоў, ня мог даць адказу. Камісіяй адзначана адсутнасьць росту ў ячэйках за лік батракоў і саўгасных рабочых. Ячэйкі не рэагавалі на антыпартыйныя ўчынкі асобных таварышоў. У гарсавецкай ячэйцы сакратар адміністраваў, ня лічачыся ні з якімі думкамі партыйцаў.

Чыстка ўскалыхнула ячэйкі, дала штуршок у далейшай працы, падняла аўтарытэт партыі ў вачох працоўных мас.

А. СУК.

Астрашыцка-Гарадзецкая арганізацыя на праверцы

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

РАЗЛАЖЭНЬНЕ, П'ЯНСТВА, СУВЯЗЬ З КУЛАКОМ

Вёска Паперня абкружана з усіх бакоў кулацкімі хутарамі. Раён—заможна-серадняцкі. У вёсцы ёсьць партыйная ячэйка. Гісторыя гэтай ячэйкі—сумная апавесьць пра камуністых, якія страцілі клясавую чуласьць, пілі, гналі самагон. За чаркаю гарэлкі ў цёплай кампаніі кулакоў і самагоншчыкаў папярнянскія «камуністыя» праводзілі «партыйную і савецкую работу». Зразумела, якая гэта была работа... Сельсавет скакаў пад кулацкую дудку. Сельсаветчыкі ўтойвалі дзесяткі дзесяцін кулацкіх зямель пры вучоце аб'ектаў абкладаньня. Работа з беднатою не вялося, кулацтва атрымлівала крэдыты і ільготы па падатку. Піў сакратар ячэйкі, піў старшыня сельсавету, піла ўся ячэйка.

Партыйцы і сельсаветчыкі перайшлі на пазыцыю кулакоў. Раённыя працаўнікі прымалі шчыры ўдзел у пагалоўным п'янстве. Былы сакратар раённага камітэту КП(б)Б ажыцьцяўляў «жывое кіраўніцтва»—заўсёды, калі бываў у Паперні—піў.

САМААБКЛАДАНЬНЕ НА КАРЫСЬЦЬ... ПАПА

Быў выпадак, калі сельсавет афіцыйна правёў самаабкладаньне на карысьць... мясцовага папа. Ганебны факт!

Старшыня сельсавету дазваляе скліканць сход сялян, на якім папоўска-кулацкія агітатары праводзяць гэту агідную антысавецкую справу. Потым па загаду старшыні сельсавету сельскі выканаўца хадзіў па хатах і зьбіраў дні папярнянскага папа сала... муку... грошы. Усё гэта рабілася ў вёсцы, якая ляжыць на адлегласьці 14 кілёметраў ад Менску...

ТАМ, ДЗЕ СЬПІЦЬ ЯЧЭЙКА...

Камісія праверыла Пчэльнянскую партыйную ячэйку. Ячэйка знаходзіцца пры лясным, торфа-распрацованым камбінаце. Камбінат—невялічкае прадпрыемства, на якім працуе ўсяго 30 рабочых. У ячэйцы—11 членаў і кандыдатаў партыі. Праверка паказала:

— Ніякай партыйна-выхаваўчай масавай работы ячэйка не вядзе. Сацыялістычнае спаборніцтва, зьніжэньне сабекошту, вярбоўка ў партыю рабочых і работніц—усе гэтыя баявыя і важныя пытаньні не займалі ўвагі пчэльнянскіх партыйцаў.

Склочніцтва, агідныя абыватэльскія плёткі, дробязныя нікчэмныя пытаньні асабістага характару занялі першае месца ў рабоце ячэйкі. Сярод рабочых камбінату панавалі антысэмецкія настроі, п'янства. Група цёмных антысавецкіх асоб праводзіла на камбінаце варожую партыі агітацыю. Ячэйка спала, а клясавы вораг дзейнічаў. Для выпаўненьня сваіх мэт ён скарыстаў адсталую частку рабочых камбінату.

«Былыя» людзі, выхадцы з варожае нам клясы, зьвілі сабе моцнае гняздо на камбінаце. Яны ўдала скарысталі бязьдзейнасьць ячэйкі, адсутнасьць палітычнага выхаваньня сярод рабочых для правядзеньня антысавецкай агітацыі.

Гэтыя элемэнты напісалі калектыўную заяву, у якой высунулі рад шкурніцкіх запатрабаваньняў.

З пунктаў заявы ясна праглядвалі імкненьні клясавага ворага, яго спробы скампрамэтаваць палітыку партыі. Пад гэтай заявай падпісаліся нават усе «камуністыя». Падпісаліся, нават не прагледзіўшы добра зьместу заявы.

Райком сваячасова рэагаваў па гэта: была праведзена растлумачальная работа. Партыйцы зьнялі подпісы з заявы.

Камуністыя і беспартыйныя рабочыя камбінату зразумелі сваю памылку. Але факт застаецца фактам. Ячэйка з гэтага павінна зрабіць адпаведны вывад. Камісія прапанавала бюро ячэйкі ўзмацніць партыйную работу і палітычна-інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых камбінату.

«У НАС БАТРАКОЎ НЯМА»...

Сакратар прылепскай ячэйкі цьвёрда ўпэўніваў праверачную камісію, што:

«Ячэйка, за лік сялян-беднякоў расьці ня можа. Бедняк—усе напісьменныя Карысьці ад іх ніякай. Беднята—гэта бандыты і хуліганы...».

Ячэйка не праводзіла работы з беднатою. Гэта зразумела: сакратар настроен супроць беднаты. Сакратар ня хоча, каб ячэйка расла за лік беднякоў... Апартунізм на практыцы.

Сакратар Беларуцкай ячэйкі заявіў на праверачным сходзе, што ячэйка ня можа расьці за лік батракоў...

Прычына: «у нас батракоў няма...».

У ваколічных вёсках і па кулацкіх гаспадарках працуе некалькі дзесяткаў батракоў..., а сакратар упарта заяўляе: «у нас батракоў няма...».

БУДНІ ПРАВЕРКІ

Чыстка раённай арганізацыі праходзіць пры актыўным удзеле працоўнага сялянства. Беднята, батракі, сераднятства праўляюць вялікую зацікаўленасьць работаю камісіі. Дапамагаюць выяўляць недахопы ў рабоце ячэек. Сядзяць на праверачных сходах да раніцы.

Пачаўся сенакос, таму сходы адкрываюцца а 9-й або 10-й гадзіне ўвечары. І ўсё-ж сялянства проста з касьбы ідзе на сходы. Падкулачнікі, п'яніцы, тыя, хто не апраўдаў годнасьці камуністага, выключаны з радоў партыі.

Батракі і беднякі пачалі падаваць заявы аб прыняцьці ў партыю. У Папернянскую ячэйку **паданы 4 заявы ад 2 батракоў, батрачкі і селяніна-бядняка.**

У Астрашыцка-Гарадзецкую ячэйку паданы 3 заявы ад сялян-беднякоў.

1 ў гэтым—дасягненьне камісіі па чыстцы Астрашыцка-Гарадзецкай арганізацыі.

Батракі і беднякі на справе ўбачылі, што падкулачнікам і п'яніцам ня месца ў партыі, што партыя сурова падыходзіць да тых, хто не праводзіць выразнай партыйнай лініі, хто падтрымлівае кулака і г. д. Недахоп у рабоце камісіі: камісія не адкрывала спрэчак па справаздачах бюро ячэек і сваіх вывадах. Гэта адбівалася на актыўнасьці сходаў.

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ ЧЫСТКІ

У Папернянскай ячэйцы выключаны з партыі: настаўніца **Кур'ян**—за эксплёатацыю батрачкі і **Батура**—загадчык торфараспрацоўкамі за п'янства і сувязь з кулацтвам.

Выключаны з партыі **Садоўскі**—сакратар Беларуцкай парт'ячэйкі, які зрываў работу ячэйкі, замазваў самакрытыку, скампрамэтаваў сябе ў вачох насельніцтва рознымі неэтычнымі ўчынкамі.

Характэрна, што на праверачным сходзе ў абарону Садоўскага выступіў былы дзяк. Затое, ніводзін батрак і бядняк ня выступілі за Садоўскага. Выключаны Гуліс—старшыня Беларуцкага сельсавету, які скрыўляў клясавую лінію, утаіў ад вучоту аб'ектаў абкладаньня 8 дзесяцін кулацкае зямлі.

НА НОВЫ ШЛЯХ

Чыстка яшчэ ня скончана. Але ўжо можна сьмела зрабіць асноўны вывад: Праверка ўскалыхнула раённую арганізацыю. Яна паставіла на новы шлях дзелавой і практычнай работы.

Праверка выкрыла рад абураючых недахопаў у рабоце асобных ячэек. П'янства, зажым самакрытыкі, скрыўленьне клясавае лініі, нежаданьне ісьці ў калгасы—усё гэта яшчэ ня зжыта ў паасобных ячэйках.

І тое, што гэтыя недахопы былі высьветлены пры актыўным удзеле мас, тое, што з партыі выкінуты непатрэбныя элемэнты—узмацніла аўтарытэт партыі сярод батракоў і беднаты.

Лепшыя, найбольш падрыхтаваныя батракі і саўгаскія рабочыя пачалі падаваць заявы аб прыняцьці ў партыю.

Камуністка **Кур'ян**, настаўніца в вёскі Паперня, доўгі час эксплёатавала батрачку **Лысак**, прымушала яе выконваць самую чорную цяжкую работу. Зараз ячэйка выключыла Кур'ян з партыі. Камісія пастанову ячэйкі зацьвердзіла, а **Лысак** падала заяву аб уступленьні ў партыю.

Г. Т—к.
Астрашыцкі-Гарадок, Меншчына.

Ня толькі чысьцім, а і папаўняем рады партыі

БЫЛЫЯ ПАРТЫЗАНЫ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ

(Цэрахаўскі раён, Гомельшчына)

Лепшым пацьвярджэньнем таго, што праз чыстку партыі, аслабаняючыся ад усяго чужога і наноснага, мы ўзмацняем свае рады і аздараўляем работу ячэек—служыць праведзеная чыстка ў сяле Леніна. У выніку чысткі гэтай ячэйкі выключаны адзін член партыі **Бабарыкін**, які ў бытнасьць прыказчыкам спажывецкага таварыства растраціў больш 300 рублёў, зусім ня прымаў ніякага ўдзелу ў партыйным і грамадзкім жыцьці, уся беднота яго ненавідзела.

Аднаму настаўніку тав. **Куфайкіну** абвешчана суровая вымова за тое, што ён біў дзяцей. Сакратару парт'ячэйкі тав. **Ігнатовічу** за слабое выкананьне партдырэктыў па калектывізацыі сельскае гаспадаркі пастаўлена на від.

Характэрна адзначыць адносіны аднаго з мясцовых камуністых тав. Шульга да калектывізацыі. На словах, у дакладах ён выступаў за калектывізацыю, а на справе, калі складаўся сьпіс жадаючых пайсьці ў калгас, гэты самы Шульга не запісаўся. На пытаньні камісіі, чаму ён ня ідзе ў калгас, ён доўга ўхіляўся ад адказу, але нарэшце, калі яму камісія запрапанавала ўступіць у калгас, ён заявіў, што «дайце мне крыху пачакаць, калі небудзь уступлю». Камісія канчаткова аб ім ня вынесла пастановы, але зоймецца высьвятленьнем пытаньня аб магчымасьці пераходу яго гаспадаркі ў калгас. Незалежна ад пастановы на гэтым факце мы можам канстатаваць праяўленьне правага ўхілу ў практычнай рабоце. У рэзалюцыях ячэйкі зазначалася аб неабходнасьці калектывізацыі і што камуністыя першымі павінны запісацца, а на справе вясковая беднота запісвалася, а камуністыя чагосьці чакалі. Гэта слабейшы вучастак у рабоце ячэйкі і камісія на гэтым пытаньні завастрыла галоўную ўвагу.

Пасьля абвяшчэньня вынікаў чысткі ў ячэйку і правертройку паступіла калектыўная заява ад 5 беднякоў, з якіх 3 былі актыўнымі ўдзельнікамі грамадзянскае вайны і чырвонымі партызанамі, большасьць з іх і зараз прымае актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце.

Вось тая заява, што падалі гэтыя таварышы: «Ведаючы, што чыстка радоў кампартыі вядзе да аздараўленьня і ўзмацненьня кампартыі, мы як былыя чырвоныя партызаны і беднякі, ўступаем у рады партыі, каб агульнымі сіламі змагацца за канчатковае шчасьце працоўных, за канчатковае зьнішчэньне капіталу ў горадзе і ў вёсцы».

1) І. Купняроў, б. партызан, бядняк.
2) В. Гуркі, серадняк.
3) К. Жураўлёў, б. партызан—бядняк.
4) Бандарэнка—бядняк.
5) Зенчанка—бядняк.

Трэба адзначыць, што да гэтага часу амаль за цэлы год ніякага росту ў ячэйцы ня было. Некаторыя з гэтых таварышоў ужо больш году наведвалі ячэйкі, былі блізкімі да партыі, але толькі таму, што ім не хапала для афармленьня па адным подпісу—рэкамэндацыі, не маглі ўступіць у партыю.

Пасьля праверкі Ленінскай ячэйкі, камісія прыехала ў сяло Кузьмінічы. Да яе прыезду сабралася вялізная група беднаты з бліжэйшых вёсак, якія перадалі тройцы рад матар'ялаў аб рабоце мясцовых камуністых.

Н. КЛЯБАНАЎ.

Важнейшае зьвяно вясковай працы

Праца з беднатою зьяўляецца важнейшым момантам ва ўсёй нашай вясковай працы. Недаацэнка значэньня гэтай працы, ігнараваньне яе належыць да ліку самых шкодных зьяў, якія, на жаль, назіраюцца (і прытым нярэдка) ў практыцы працы, у партыйных, савецкіх, каапэрацыйных і іншых арганізацый. Асяродкам, з якога вынікаюць падобныя зьявішчы, падобныя скажэньні партыйнай лініі, бязумоўна зьяўляюцца правыя настроі.

Па сутнасьці справы, цэнтральным момантам мыляньняў правай апазыцыі зьяўляецца іменна ігнараваньне ці проста забываньне наяўнасьці ў вёсцы клясавых супярэчнасьцяй і клясавай барацьбы. Ілюзія правай апазыцыі аб адсутнасьці клясавых супярэчнасьцяй у нашай вёсцы вядзе да затушоўваньня рэвалюцыйнай пільнасьці пралетарыяту, да паслабленьня працы з беднатой, да паслабленьня працы па ўзмацненьні блёку беднаты і сераднякоў супроць кулакоў, да ўсыпленьня рэвалюцыйнай актыўнасьці беднаты, яна дэзорыентуе партыю ў сэнсе выразнай клясавай працы на вёсцы. Ва ўсёй нашай працы з беднатой рашаючае значэньне мае працэс уцягненьня яе ў аграмаджаны сэктар. Усё большае разгортваньне ў працэсах вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі, усё большае прыцягненьне ў калгасы беднаты, будаўніцтва машынатрактарных станцый складаюць умовы для зжываньня беднаты, для рэзкага ўадыму гаспадарчага і культурнага яе ўзроўню.

Гэты шлях зьяўляецца самым рэдыкальным у сэнсе ўадыму бядняцкіх гаспадарак і выхаду з бядняцкага становішча. Аднак, гэта ні ў якай ступені не паслабляе нашай працы аб бязупынным гаспадарчай дапамозе бядняцкім індывідуальным гаспадаркам. Бядняцкія гаспадаркі ў пэўнай ступені ўадымаюцца, дзякуючы падтрыманьню пралетарскай дзяржавы, і аказаньне ім вытворчай дапамогі зьяўляецца актуальнай задачай. Вялікая колькасьць бядняцкіх гаспадарак яшчэ даволі вялікі пэрыяд будзе існаваць як індывідуальная гаспадарка. І цяперашняе падтрыманьне пралетарскай дзяржавы ратуе іх ад разбурэньня, падрыхтоўваючы ў той-жа час глебу для будучай калектывізацыі.

У сучасны момант перад намі стаіць задача арганізацыі вытворчай дапамогі бядняцкім гаспадаркам у уборачную і асеньнюю пасеўную кампанію. У пэрыяд уборкі і абмалоту ўраджаю беднота, якая ня мае машын, лёгка падпадае ў залежнасьць ад заможных і кулацкіх элемэнтаў, якія маюць складаныя машыны і прылады. **Аказаньне ў гэты пэрыяд шырокай масавай дапамогі беднаце з боку нашых арганізацый вызваліцца ад кулацкай эксплёатацыі, з аднаго боку, і з другога, захаваць у руках беднаты тую частку ўраджаю, якая падае ў рукі кулацтва пры скарыстаньні беднатой яго сродкаў вытворчасьці.**

Саўгасы і калгасы ў меру сваіх вытворчых магчымасьцяў могуць і павінны ўключыць у плян сваёй працы неабходнасьць **сабраць і абмалаціць пэўную частку ўраджаю беднаты і арганізаваць рамонт машын і прылад, потым дапамагчы пажаць і абсеяць пэўную колькасьць зямлі, ачысьціць насеньне і арганізаваць абслугоўваньне бядняцкіх гаспадарак аграпэрсаналам.**

У працу па вытворчай дапамозе беднаце павінна быць уключана ўся савецкая грамадзкасьць з тым, каб гэта праца прыняла шырокі грамадзкі характар. Сур'ёзную ролю ў гэтых адносінах могуць адыграць рабочыя брыгады шэфскія арганізацыі і г. д.

Нарэшце сацыялістычныя спаборніцтвы, якія разгарнуліся на вёсцы, павінны ўключыць у справу спаборніцтва таксама і лепшую, больш арганізаваную, больш эфэктную вытворчую дапамогу беднаце.

Партыя па сваёй лініі павінна разгарнуць вялізную працу па арганізацыі беднаты, па арганізацыі эканамічнай дапамогі ёй.

Па якасьці і вялічыні гэтай працы асобных сваіх арганізацый партыя будзе судзіць, наколькі правільна яны праводзяць партыйную лінію. Бо невыстарчальна прымаць рэзалюцыі ці карысьць генэральнай лініі. Трэба ажыцьцяўляць генэральную лінію.

ДА УСЕБЕЛАРУСКАГА ПІЯНЭРСКАГА ЗЬЛЁТУ

ПЫТАНЬНІ, ЯКІЯ ЧАКАЮЦЬ СВАЙГО АДКАЗУ

Упяршыню за 12 год камсамол праводзіць піянэрскія зьлёты. Марудная, невыстарчальная падрыхтоўка да зьлёту прымушае нас зьвярнуць увагу пралетарскай грамадзкасьці на неабходнасьць пасарыць падрыхтоўку да зьлётаў.

Нашай задачай зьяўляецца — арганізаваць дзіцячую ініцыятыву, накіраваць яе па шляху ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве краіны. Паставіць справу выхаваньня малодшага пакаленьня так, каб дзіцячая камуністычная арганізацыя зьявілася сапраўдным памочнікам партыі і ўлады ў справе абароны сацыялістычнай бацьпаўшчыны пралетараў усяго сьвету — СССР.

Прыкаваць увагу пралетарскай грамадзкасьці — у першую чаргу прафсаюзаў — да штодзённай дапамогі піянэрскай арганізацыі, у яе жыцьці і працы — вось наша задача. Кожны работнік, служачы, селянін павінен ведаць аб жыцьці піянэраў, мала ведаць, павінен клапаціцца аб палепшаньні ўмоў піянэрскай працы.

Узяць хоць бы пытаньне аб жыльлёвым будаўніцтве, дзе скрозь забываюць аб тым, што ў вялікім доме, што будуецца, абавязкова трэба вылучыць дзіцячую пляцоўку для гульняў зімою, пакой для дзіцячага клюбу, для дзіцячых ясьляў. Ці возьмем для прыкладу грамадзкае харчаваньне, пабудову сталовак. Тут таксама забываюць аб тым, што трэба наладзіць харчаваньне ня толькі дарослых рабочых, але і дзіцячае харчаваньне, узяць пытаньне аб школе, аб каапэрацыі, якая зусім не клапоціцца, каб даць такія ўзоры вопраткі і абутку, якія патрэбны дзіцяці рабочага і селяніна. Якую галіну працы мы не ўзялі, цяжка і не мажліва абыйсьці пытаньне аб дзецях.

А між тым гэта пытаньне абыходзяць, і месца дзіцяці, месца дзіцячага камуністычнага руху нязьмерна яшчэ малое ў параўнаньні з тым, якое мы яму павінны адвесьці.

Мы зараз павінны патрабаваць ад прафэсыянальных, савецкіх, грамадзкіх устаноў і арганізацый даць справаздачы на старонках друку аб тым, што зроблена да зьлёту, што зроблена па здавальненьні патрэб дзяцей.

Што зроблена прафсаюзамі па выхаваньні дзяцей рабочых і служачых? Якую аказваюць у гэтым напрамку прафсаюзы дапамогу камсамолу? Як прафсаюзы ўдзельнічаюць у школьным будаўніцтве, як праводзяць працу сярод бацькоў вучняў, як улічваюць інтарэсы дзяцей, што робяць для здавальненьня запатрабаваньняў дзятвары?

Мы ўжо вышэй спыняліся на тым, што спажывецкая каапэрацыя невыстарчальна, а пад час і зусім нічога ня робіць у справе здавальненьня ўсім неабходным спажыўца-дзіцяці.

Мы патрабуем ад спажывецкай каапэрацыі даць адказ на наступныя пытаньні:

Што зроблена на наладжваньні дзіцячага грамадзкага харчаваньня, які ўдзел каапэрацыя бярэ ў справе арганізацыі гарачых сьнеданьняў у школах?

Ці займалася спажывецкая каапэрацыя гэтымі пытаньнямі, і якія маюцца вынікі?

Як падбіраецца асартымэнт дзіцячых тавараў у магазынах каапэрацыі? МЦРК павінен зараз-жа распачаць падрыхтоўку да грамадзкага харчаваньня ўдзельнікаў Усебеларускага зьлёту піянэраў.

Наркамасьветы павінен даць справаздачу, што ім робіцца па будаўніцтве фабрычна-заводзкіх сямігодак, як палепшаюцца ўмовы для навучаньня ў сямігадовых школах дзяцей батракоў, беднякоў, як апошнія забясьпечаны інтэрнатамі, якая аказваецца матар'яльная дапамога, што зроблена Белдзяржкіно па абслугоўваньні дзіцячага мядацтва, як у пяцігадовым пляне прадугледжана вытворчасьць дзіцячых кіностужак.

Абмежавацца толькі здымкамі самога зьлёту з боку Балдзяржкіно ў гэтым напрамку ніяк ня можна, трэба паказаць усю сыстэму працы на здавальненьні патрэб малодшага пакаленьня.

Нас цікавіць, чаму да гэтага часу нічога ня робіць Цэнтральны Савет Асавіяхіму? Чаму апошні не адказвае на заклік ЦК ЛКСМБ арганізаваць вайскова-фізкультурны аддзел пры Усебеларускай выстаўцы, якая рыхтуецца да піянэрскага зьлёту?

Чаму да гэтага часу буйнейшыя менскія заводы, як «Энэргія», «Вальшавік» нічога ня робяць да зьлёту?

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб становішчы і бліжэйшых задачах піянэрскага руху гаворыць:

— «У законадаўчым парадку забясьпечыць пабудову памяшканьняў для працы з дзецьмі пры пабудове новых камунальных дамоў, клюбаў, прадпрыемстваў і паселкаў.

Дзяржпляну, Наркамасьветы, Наркамату аховы здароўя уключыць у пяцігадовы плян будаўніцтва культурных устаноў сеткі дзіцячых клюбаў, пляцовак, бібліятэк і кіно».

Мы павінны на мясцох дабівацца выкананьня гэтае пастановы. Зараз у часе падрыхтоўкі да зьлёту, мы не павінны забываць, што гэты зьлёт — гэта не парад, гэта сур'ёзны палітычны агляд, экзамен таму, што мы прарабілі ў гэтай галіне за дванаццаць год.

МЯЖЭВІЧ.

На шляхох культурнай рэвалюцыі

Літаратура народаў СССР перакладаецца на расійскую мову

Выданьне твораў беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў

Ґутарка з членам калегіі Дзяржвыдавецтва т. Равічэн-Чаркаскім

Масква (наш кар.)

Пытаньне аб перакладах з нацыянальных моваў СССР, як адна з праблем культурнае рэвалюцыі, стала перад Дзяржвыдавецтвам у сярэдзіне 1928 году. Пачынаючы з гэтага часу, Дзяржвыдавецтва зрабіла вялізную работу. У першую чаргу намечаны і распрацаваны пляны па выданьні літаратуры найбольш перадавых у культурных адносінах нацыянальнасьцяй (Украіны, Беларусі, Грузіі, Арменіі).

Прыезд украінскіх пісьменьнікаў у Маскву дапамог значнаму пашырэньню і паглыбленьню гэтай работы і выклікаў вялікую зацікаўленасьць з боку расійскіх чытачоў да нацыянальнае літаратуры. Яшчэ ў 1928 годзе Дзяржвыдавецтва выдавала украінскіх клясыкаў пры амаль што бесстароньніх адносінах да іх з боку нашых чытачоў і ў невялікіх тыражох. А ў 1929 годзе Дзяржвыдавецтва перайшло ўжо да выданьня сучаснай нацыянальнай літаратуры, арыентуючыся ўжо ня толькі на перадавыя нацыянальнасьці, але і на больш адсталыя.

У 1929 годзе плян выданьня украінскіх пісьменьнікаў першапачаткова быў распрацаваны на 115 друкаваных аркушох, а потым пашыраны да 150 аркушоў. Нарада пры ЦК УсеКП(б) запрапанавала выдаць дзьве-тры кнігі па гісторыі украінскае літаратуры. Намечаны плян праводзіцца ў жыцьцё ўзмоцненым тэмпам. Заключаны дагаворы з найбольш выдатнымі прадстаўнікамі украінскае пралетарскае літаратуры. З украінскіх паэтаў намечаны да выданьня на 1929 год творы—Паўло Тычыны, Міколы Важан, Сасюры і Блакітнага. Пераклады робяць лепшыя прадстаўнікі расійскае паэзіі (Сельвінскі, Багрыцкі, Сьвятлоў, Галодны, С. Гарадзецкі і інш.).

Хутка будуць выданы: зборнік дакумантаў і матар'ялаў па украінскай літаратуры за 10 год, кніга Лейтэса—«Сілуэты украінскіх пісьменьнікаў», і кніга т. Скрыпніка аб нацыянальнай культуры. Ўвогуле першапачатковы плян па украінскай літаратуры будзе даведзен да 200 аркушоў.

З посьпехам праводзіцца таксама работа па выданьні літаратуры іншых нацыянальнасьцяй. **Па беларускай літаратуры Дзяржвыдавецтва выдасьць кнігі лепшых пісьменьнікаў. Да гэтага часу выданы—Якуб Колас «У глушы Палесься», апавяданьні Цішкі Гартнага і інш. У бліжэйшыя дні выйдуць апавесьці Бядулі. Выключным момантам у выданьні беларускае літаратуры ня толькі па мастацкім значэньні, але галоўным чынам па палітычным—мае выданьне зборніка паэзіі роданачальніка беларускае літаратуры Янкі Купалы, нядаўна абранага ў Украінскую Акадэмію Навук.**

Янку Купалу ведаюць ня толькі шырокія масы Савецкай Беларусі, але і зарубежнай Заходняй Беларусі. Такім чынам, выданьне яго твораў набывае вялізнае палітычнае значэньне. Апрача таго, выдаюцца зборнікі прозы Міхася Зарэцкага, беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў (БелАПП), другі том твораў Коласа і зборнік Міхася Чарота.

З грузінскай літаратуры да гэтага часу выданы Джэбахашвілі—«Батраки», Суліашвілі «Горящий уголь», зданы ў друк творы Нінашвілі, Полумардвінаў, Ніко Лоркіпанідзэ і іншых выдатнейшых прадстаўнікоў пралетарскай і папутніцкай літаратуры. Апрача таго, у бліжэйшы час Буачыдзэ заканчвае работу па гісторыі сучаснай грузінскай літаратуры.

Па армянскай літаратуры толькі што выйшлі з друку кнігі Аксэль Бакунца «Темное ущелье», падрыхтаваны да выданьня Шырван-Задэ «Хаос», Стэфан Зара «Девушка из библиотеки», другі том Бакунца—«Овнатан Марч», «Армэн» і інш. Падрыхтоўваецца да друку нарыс аб сучаснай армянскай літаратуры ленінградзкага крытыка Гайк Адонц.

Па яўрэйскай літаратуры выпушч

А. П. Чэхаў

(Да дваццаціпяцігодзьдзя са дня сьмерці)

Унук прыгоннага селяніна, вядомы пісьменьнік Антон Паўлавіч Чэхаў нарадзіўся ў Таганрогу ў 1860 г. Мала весялосьці далі Чэхаву яго дзіцячыя гады. Цяжкае жыцьцё ў сям'і бацькі—дробнага гандляра, прымусовы ўдзел у ненавісным царкоўным хоры пад кіраўніцтвам бацькі не давалі размаху. 19-гадовы Чэхаў быў ужо ў Маскве студэнтам мэдычнага факультэту. Хоць пісьменьніцтва хутка і выцясьняе мэдыцыну, але Чэхаў шмат чым абавязан сваёй доктарскай дзейнасьці. Ён сам заўсёды падкрэсьлівае сваю мэдычную асьвету і гапарыцца тым, што ў яго апавяданьнях ня знойдзецца супярэчнасьці з навукаю. Прафэсія доктара разьвіла ў яго наглядальнасьць і навучыла навуковаматэрыялістычна падыходзіць да ўсякіх зьяваў жыцьця.

З 1-га курсу унівэрсытэту, Чэхаў пападае ў кепскае матар'яльнае становішча—на яго плечы ўскладаецца і сям'я абяднеўшага бацькі. У пагоні за заработкам Чэхаў бярэцца за літаратуру і хутка пачынае працаваць у тагочасных гумарыстычных часопісях «Будильник», «Осколки» і інш. Гэтыя часопісі зьмяшчалі больш анэкдоцікі і жарты ў адносінах кунцоў, зубных дактароў, тэатральных і літаратурных кіраўнікоў і г. д. Закранаць што-небудзь больш сур'ёзнае, зьявы грамадзкага жыцьця, сурова забаранялася. І Чэхаву за жабрацкую трохрублёвую ўзнагароду прыходзілася пісаць сьмешныя апавяданьніцы, анэкдоты і вясёлыя куплеты, а часта і проста надпісы да гумарыстычных малюнкаў. Але гэта чорная літаратурная работа не прапала дарма: дзякуючы ёй Чэхаў выпрацаваў надзвычайнае ўменьне жыва і трапна падкрэсьліць камічныя рыскі, якія ня радуюць нас у пазьнейшых апавяданьнях. Цяжкі матар'яльны стан доўга прасьледваў Чэхава. Ужо стаўшы вядомым пісьменьнікам, ён вельмі часта ня меў нават рубля. Толькі ў апошнія гады матар'яльны дабрабыт Чэхава паляпшаецца.

У 1890 г. Чэхаў едзе ў цяжкое падарожжа, на катаргу на Сахалін (чыгункі ў Сібіры тады яшчэ ня было) і ў сваіх нарысах выкрывае страшэнны малюнак бясправнасьці высланых і зьняволеных. У часе халеры ў 1892 г., ён самааддана і задарма працуе доктарам на барацьбе з эпідэміяй, пазьней, у Крыме ён увесь аддаецца справе дапамогі хворым на сухоты, зьбірае грошы для пабудовы санаторыя і інш. У 1901 г. Чэхава абіраюць ганаровым членам Акадэміі Навук, але калі праз год выключаюць са складу членаў Акадэміі пісьменьніка Максіма Горкага за яго рэвалюцыйную дзейнасьць, Чэхаў з абурэньнем адмаўляецца ад годнасьці акадэміка.

Пражыў Чэхаў нядоўга: сухоты заўчасна зьвялі яго ў магілу. Ён памёр 15-га ліпеня 1904 году ў нямецкім горадзе Бадэнэйлеры.

З дасканалым уменьнем і мастацтвам апісвае Чэхаў усе разнавіднасьці інтэлігенцкага мяшчанства. Надзвычайна прыгожае апавяданьне «Человек в футляре», у якім паказаны настаўнік гімназіі Белікаў—выяўленьне царскага паліцэйскага рэжыму. Усяляк імкнуўся ён адмовіцца ад жыцьця, захавацца ў «футарал»—хадзіў заўсёды ў галёшах, у ватніку і цёмных акулярах. Думку сваю Белікаў таксама імкнуўся захаваць у «футарал». Для яго былі яснымі абежнікі і газэтныя артыкулы, у якіх што-небудзь забаранялася. Калі ў абежніку забаранялася вучням выходзіць на вуліцу пасьля 9-е гадзіны ўвечары... дык гэта было для яго ясна і выразна «забаронена і канец». Усякі дазвол, нават аматарскага спэктаклю ў горадзе, яго палохаў. Яно, зразумела, усе гэта так, усё гэта добра, але як-бы там чаго ня вышла». Падобныя «чалавекі ў футарале» душылі жыцьцё, дзякуючы ім, пышнай кветкаю квітнелі бюракратызм і падхалімства

Чэхаў—вялікі і тонкі мастак. Яго апавяданьні—часамі журботныя, часьцей сьмяшлівыя—заўсёды цікавыя, яго вобразы надоўга застаюцца ў памяці чытача. Буйныя творы яму не ўдаваліся. Чэхаў—майстар маленькага апавяданьня. Ва ўменьні некалькімі рыскамі падмеціць сьмешныя бакі чалавека, ён ня ведае сабе роўных. Нашым пачынаючым пісьменьнікам вельмі карысна праглядаць Чэхава. Але ня ў гэтым толькі яго значэньне. Мяшчанская пошласьць і тупасьць, дзікасьць і невуцтва моцна ўкараніліся ў нашым жыцьці. Чэхаўскія гэрої да гэтага часу жывуць вакол нас. З Чэхавым ў руках нам лягчэй іх выкрыць і павесьці з імі рашучую барацьбу.

Е.

Чыгуначнікі дапамаглі правядзеньню веснавой пасеўнай кампаніі

Арганізавана 12 рабочых брыгад.—Сабрана 10 тысяч руб. на закупку с.-г. інвэнтару

Пытаньне аб пасеўнай кампаніі ня раз разглядалася на прэзыдыумах і пленуме Бел. Бюро ЦК чыгуначнікаў. Вынесена шмат пастаноў аб удзеле чыгуначнікаў у правядзеньні веснавой сяўбы.

Прафсаюзы чыгуначнікаў добра зразумелі важнае значэньне кампаніі; аб гэтым гавораць самі факты.

У часе веснавое сяўбы было арганізавана 12 рабочых брыгад з 46 чыгуначнікаў па вялікіх чыгуначных вузлох БССР, спэцыяльна для рамантаваньня с.-г. прылад былі адкрыты 3 майстэрні-вагоны, якія паправілі 1.075 старых плугоў, 163 бараны, 25 вазоў, набыта для бяднейшых сялян 48 новых плугоў і барон. Чыгуначнікі Жлобінскага, Віцебскага і Аршанскага вузлоў на сваіх агульных сходах адлічылі з свайго заработку 3.500 руб. на дапамогу веснавой сяўбе.

Усяго сабрана на гэту мэту 9.242 руб.; якія пайшлі на закупку с.-г. інвэнтару для вёскі.

Для правядзеньня растлумачальнай працы сярод сялянства на вёску было накіравана 210 рабочых.

Зараз пачынаецца асеньняя пасеўная кампанія.

Прафарганізацыі чыгуначнікаў павінны максымальна дапамагчы гаспадарчай і палітычнай арганізацыі беднаты, дапамагчы правесьці як найлепш асеньнюю пасеўную кампанію.

Ф. ІСАЕЎ.

РЭАЛІЗАВАЦЬ ТВОРЧЫ УЗДЫМ МАС

Каля 60 проц. рабочых здалі аблігацыі на калектыўнае хаваньне

Пры належнай растлумачальнай рабоце можна дабіцца значна большых вынікаў

У гутарцы з нашым супрацоўнікам загадчык галоўнай ашчаднай касы т. Падольскі заявіў:

— Галоўная ашчадная каса правяла на прадпрыемствах і ва ўстановах г. Менску 92 сходы, на якіх растлумачаны прынцыпы і мэты калектыўнага хаваньня аблігацый.

Калі надлічыць вынікі гэтай кампаніі па сёньняшні дзень, дык трэба сказаць, што з агульнай калектыўнай падпіскі на 2-ю пазыку праз галоўную касу ў 808 тысяч рублёў ужо здана на калектыўнае хаваньне аблігацый на суму 250 тысяч рублёў і праз індывідуальную падпіску каля 50 тыс. руб. Аплачаных, але не забраных яшчэ аблігацый у касе знаходзіцца на 175.000 руб. Разам з гэтым 175.000 руб. будуць перададзены на калектыўнае хаваньне, што складае каля 60 проц. усіх рэалізаваных праз касу ашчаднасьці аблігацый. Гэта, бязумоўна, зьяўляецца вялікім дасягненьнем.

Адносіны рабочых да калектыўнага хаваньня вельмі добрыя калі заводзкія арганізацыі займуцца, як належыць, растлумачэньнем значэньня калектыўнага хаваньня, можна быць упэўненым, што тыя рабочыя, якія забралі аблігацыі, здадуць іх на хаваньне.

Нельга не адзначыць вельмі спрыяючых адносін рабочых мас да выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі. Рабочыя заводу «Бальшавік», «Камунар», працкалектыву тэкстыльшчыкаў і друкарні «Зьвязда» пры правядзеньні сходу аб калектыўным хаваньні патрабавалі выпуску новай пазыкі індустрыялізацыі.

На некаторых прадпрыемствах ужо праводзіцца напярэдняя падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Ня кажучы ўжо аб тым, што задача ўзмацненьня дзяржаўнага крэдыту і рэалізацыі пазык зьяўляецца справай усёй грамадзкасьці, крэдытныя установы павінны ў першую чаргу добра падрыхтавацца да рэалізацыі будучай пазыкі. Для гэтай мэты ў 20-х чыслах ліпеня па ўсіх акругах БССР будуць скліканы нарады працаўнікоў усіх кас ашчаднасьці.

Разам з гэтым трэба мець на ўвазе, што найлепшая падрыхтаванасьць крэдытнага апарату бяз самага актыўнага ўдзелу камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту, партыйных і прафэсыянальных арганізацый ня дасьць належных вынікаў. Зараз павінна быць зьвярнута на складаньне аўтарытэтных камісій садзейнічаньня на прадпрыемствах, пры установах у раёнах і сельсаветах.

Папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі

Супрацоўнікі ЦВК і СНК БССР у ліку 40 чалавек падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на суму 6.000 рублёў.

Падпісацца ўсім калектывам у разьмеры месячнай пэнсіі

Агульны сход супрацоўнікаў ЦК і ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і Музэю Рэвалюцыі пастанавіў:

— Прымаючы пад увагу, што для правядзеньня тае грандыёзнае працы, якая намечана пяцігадовым плянам будаўніцтва СССР і БССР, патрэбны вялікія сродкі, зараз-жа яшчэ да выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі папярэдня падпісацца на пазыку ў разьмеры ня менш месячнага заработку ўсім калектывам (прыкладна, каля 13 тысяч рублёў). Агульны сход заклікае пасьледваць іх прыкладу калектывы ЦСПСБ, ЦВК, СНК, ДПУ і Мен. акругкому.

— Атрыманыя процантныя адлічэньні за распаўсюджваньне 2-ой пазыкі ў суме 27 руб. унесьці ў фонд індустрыялізацыі СССР.

— Дзень 6-га жніўня лічыць працоўным днём на карысьць фонду індустрыялізацыі СССР.

ЗЬВЯЗДА

ПАБУДОВА НОВЫХ ТОРФАЗАВОДАЎ

2 мільёны рублёў на капітальнае будаўніцтва па тарфянай прамысловасьці

Белторф распрацаваў плян капітальнага будаўніцтва на 1929-30 год. Паводле гэтага пляну, Белторфам у будучым годзе затрачана будзе на капітальнае будаўніцтва звыш 2 мільёнаў рублёў.

Намечаны пабудовы: ізаляцыйнападсьцілачнага заводу у Полацкай акрузе, 2 тарфяных заводаў у Магілеўшчыне і брыкетнага заводу (брыкет—спрасаваны пад моцным ціскам торф), месца пабудовы яшчэ ня вызначана.

Акрамя таго, намечана пашыраць 3 торфзаводы—«Дымаўшчыну», «Беларусь» і «Чырвоны Кастрычнік».

Двухтыднёвік фізкультуры ў БССР

На культпрадзе ЦСПСБ зацьверджаны плян правядзеньня двухтыднёвіка фізкультуры па БССР. Двухтыднёвік праводзіцца з 27 ліпеня па 15 жніўня. Фізкультурнікі павінны прыняць шырокі ўдзел у правядзеньні Міжнароднага Чырвонага Дня і дня індустрыялізацыі.

У часе двухтыднёвіка будзе праведзена праверка сацыяльнага складу гурткоў фізкультуры.

Гарадзкія гурткі фізкультуры выедуць у вёскі. Разам з гурткамі выедуць спэцыяльныя брыгады моладзі, якія будуць арганізоўваць на вёсцы спартыўныя пляцоўкі, бібліятэчкі і г. д.

Намечаны рад масавых экскурсій за горад пры шырокім удзеле спартыўных гурткоў. Па прадпрыемствах будуць праведзены спаборніцтвы па ўсякіх відах фізкультуры.

ЦСПСБ, ВСНК, Наркамаховы здароўя і Асоавіяхім арганізуюць фізкультурную выстаўку. Арганізуецца таксама кансультацыя, якая будзе даваць парады па пытаньнях спорту.

Белдзяржкіно ў часе двухтыднёвіка будзе дэманстраваць карціны на фізкультурныя тэмы.

ШТО І ЯК МЫ БУДУЕМ

У Белдзяржбудзе нашаму супрацоўніку паведамілі аб ходзе будаўніцтва ў бягучым сэзоне па Меншчыне і іншых акругах БССР наступнае:

Зараз Белдзяржбуд заканчвае рад пабудоў.

У Менску сёлета будуць закончаны пабудовы 2 прафсаюзных клюбаў (мэталістых і харчавікоў). Клюбы будуюцца па апошнім слове тэхнікі.

На рэвалюцыйнай вуліцы ідзе пабудова жыльлёвага дому для членаў саюзу харчавікоў, які таксама будзе скончаны ў бягучым годзе.

На пабудове унівэрсытэцкага гарадка праз 2 месяцы будуць скончаны чатыры карпусы (анатамічны, мэдыцынскі, прыродазнаўчы і хэмічны). Зараз у гэтых карпусох праводзіцца ўнутранае абсталяваньне.

Пабудова галоўнага корпусу унівэрсытэцкага гарадка будзе скончана ў будучым будаўнічым сэзоне. Зараз ужо выводзіцца 3-ці паверх корпусу і вядуцца работы па бэтонным перакрыцьці.

З новых пабудоў у Менску, пачатых у бягучым годзе, як найбольш буйныя, трэба адзначыць наступныя:

Жыльлёвы дом для рабочых «Меншвэю» на 36 кватэр (Нямецкі завулак). Зараз ужо прыступлена да пабудовы 3-га паверху дому. Закончаны цалкам ён будзе ў пачатку будучага сэзону.

Фабрыка цукерак (Ляхаўка). Цокальны паверх ужо гатовы, прыступлена да пабудовы першага паверху.

Ліцейны цэх на заводзе «Энэргія» — заканчваецца кладка сьцен.

На гарбарні «Бальшавік» будуецца памяшканьне для сокаваркі. Фундамант памяшканьня ўжо зроблены.

Жыльлёвы дом на 72 кватэры на рагу вуліц Камсамольскай і К. Маркса.

Акрамя гэтага Белдзяржбуд робіць рамонт раду дамоў.

Пабудова **дому ўраду** пачнецца яшчэ ў бягучым сэзоне. Зараз праводзіцца конкурс на лепшы праект дому. Усяго прадстаўлена 19 праектаў інжынэрамі Ленінграду, Масквы і Менску. У канцы ліпеня праекты будуць разгледжаны, і Белдзяржбуд прыступіць да распрацоўрабочых чарцяжоў.

ШТО БУДУЕЦЦА Ў АКРУГАХ БССР

Вялікія пабудовы пачаты ў бягучым годзе ў Воршы і Магілеве.

У Воршы пачата пабудова вялікага рабочага гарадка на 3.000 чал. Пры гарадку будуць тэатр, амбуляторыя, лазьні, пральня. Электраэнэргія ў гарадок будзе падавацца з Асінбуду. Гарадок будзе адкрыты ў 1931 годзе. У ім будуць разьмешчаны рабочыя ільнапрадзільнага камбінату, які зараз будуецца ў Воршы.

У Магілеве пачата пабудова гарбарні. У бліжэйшы час будзе прыступлена да пабудовы вялікай фабрыкі штучнага шоўку. Акрамя таго, ужо ідуць работы па аднаўленьні жыльлёвага дому на 30 кватэр для служачых вышэйпамянёнае фабрыкі.

У Віцебску заканчваюцца пабудовы фабрыкі «Вітшпэй» і клюбу мэталістых.

У Барысаве гэтымі днямі была зроблена закладка дрэваапрацовачнага камбінату. У кастрычніках сьвяты будзе пушчана новая запалкавая фабрыка.

Апрача гэтага, у Барысаве будуецца 30-кватэрны рабочы дом і заканчваецца пабудова клюбу хэмікаў.

Асноўнага будаўнічага матар'ялу — цэглы на бягучы сэзон хопіць. Праўда, зараз адчуваецца некаторая замінка в падвозам цэглы (у сувязі з паливымі работамі), аднак з гэтым становішчам удасца справіцца.

Іншых матар'ялаў для пабудоў таксама хопіць. Такім чынам, затрыманьня ў пабудовах у бягучым годзе ня будзе.

Трэба адзначыць, што Белдзяржбуд прыняў меры для эканоміі будаўнічых матар'ялаў. Так, у некаторых дамох сьцены першых і другіх паверхаў кладуцца ў 1 з палов. цэглы, а 3-х паверхаў—у 2 цэглы. Унутраныя сьцены на Менскай фабрыцы цукерак і іншых кладуцца ў 1 з палов. цэглы. Гэта мерапрыемства ня толькі эканоміць цэглу, але значна зьніжае і сабекошт будаўніцтва.

С. Г.

Бярэце прыклад

Агульны сход рабочых заводу «Бальшавік» пастанавіў на працягу 5-ці месяцаў поўнасьцю пакрыць запазычанасьць па дыферэнцыяваным паі. Гэта прапанова папярэдня была абмяркована па цэхах. Рабочыя заводу «Бальшавік» пастанавілі выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва па збору паю рабочых заводаў: «Энэргія», «Камунар», «Чырвоная Зорка», Меншвэй» і абутнаваю фабрыку.

Па Савецкай Беларусі

Грамадзкі камітэт, ці трэст гандляроў

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Полацкі гарадзкі камітэт узаемадапамогі ня можа пахваліцца крыштальнасьцю сацыяльнага паходжаньня свайго складу. Праўда, два месяцы назад з камітэту павыганялі гандляроў, якія выраішылі пытаньне аб дапамозе... гарадзкой беднаце (!).

«Ластаўкі» павыляталі, але гнёзды засталіся. Увесь апарат, пачынаючы з самога камітэту і канчаючы прыказчыкамі крам, складаецца з учарашніх гандляроў.

Рахункаводам працуе Абрамзон, бацька якой і яна сама пазбаўлены права голасу. Учарашні буйны гандляр, які меў свой магазын пачыньня, служыць у гаркамітэце загадчыкам крамы пачыньня, якая кожны дзень дае дэфіцыт. Баркан, які ўчора яшчэ меў сваю чайную з падпольным шынкарствам, аказваецца раптам «спэцам» і становіцца загадчыкам пральні.

Гольдзін, былы буйны полацкі гандляр, раней працаваў у краме дзіцячай камісіі, адкуль РСІ зьняла яго з працы за п'янства, знаходзіць сабе [illegible] прытулак—загадвае тутнёвым.

[illegible]ваў гаркамітэт адкрыць фатаграфію прыватная закрылася. Ён адкрыў яе, пазычыўшы грошай у вядомага спэкулянта Шульмана пры ўмове, што Шульман будзе працаваць у фатаграфіі вартаўніком (!) за 40 руб. у месяц.

Ч.

20 вылучэнцаў будуць падрыхтаваны да працы ў апараце

Ворша (наш кар.). Прафсаюзамі Аршаншчыны вылучана 20 рабочых ад варштату і батракоў на адказную працу ў савецкім апараце. Вылучэнцы камандыруюцца на курсы па падрыхтоўцы.

Усе вылучаныя рабочыя і батрак зьяўляюцца актыўнымі грамадзкімі працаўнікамі.

Адкрыліся курсы сельсаветчыкаў

ВОРША. (Наш кар.). Адкрыліся курсы па перападрыхтоўцы сакратароў і старшынь сельскіх і местачковых саветаў і вылучэнцаў, якія працуюць у райвыканкомах Аршаншчыны. На ўрачыстым пасяджэньні з прывітаньнямі выступалі прадстаўнікі прэзыдыуму акрвыканкому, акругкому, акруговага бюро прафсаюзаў, акругкому КСМ, гарсавету і Чырвонай арміі.

Задача курсаў—даць канкрэтныя веды аб працы саветаў на вёсцы, аб структуры савецкай улады, аб рабоце з бядняцкім і серадняцкім актывам вёскі і моладзі.

Курсы будуць працаваць на працягу аднаго месяца.

Новая швэйная фабрыка

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Адкрылася новая швэйная фабрыка, абсталяваная па апошнім слове тэхнікі. Урачысты сход рабочых паслаў прывітальную тэлеграму Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б, в якой запэўняе, што рабочыя-швэйнікі пад кіраўніцтвам партыі выканаюць задачы, ускладзеныя на іх 5-гадовым плянам.

Арганізаваны малочны саюз

МАЗЫР. (Наш кар.). Умовы Мазырыны спрыяюць разьвіцьцю жывёлагадоўлі і малочнае гаспадаркі. Між тым дагэтуль сетка малочных арцеляй па акрузе невялікая (налічваецца ўсяго 2[illegible] малочных таварыстваў з лікам пайшчыкаў у іх 1.810 чал.). Акрсельсаюз не змог сваім кіраўніцтвам ахапіць малочныя таварыствы, і таму часта арганізоўваліся таварыствы там, дзе яны не маюць ніякай базы, таму канечным вынікам некаторыя з іх закрываліся (за 1928-29 г. распалася 10 малочных таварыстваў).

Мазырскі акруговы зьезд малочных таварыстваў 14 ліпеня арганізаваў акруговы малочны саюз.

Б. Ш.

Частыя пажары

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У апошні час вёсках акругі ад няўмелага абыходжаньня агнём сталі частыя пажары. У вёсны Прыпяці згарала 8 двароў, у Няглюбаўцы—9, Рочыцы—7, Папсоўцы—7 і г. д. Гэты частыя пажары тлумачацца тым, што сельсаветы непадрыхтаваны да барацьбы з пажарамі. Абавязковая пастанова акрвыканкому аб супрацьпажарных мерапрыемствах ня выконвалася.

* * *

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Страты ад пажар ў Чачэрску дасягаюць 75 тысяч рублёў. Дзяржстрах пачаў выплату страхавых прэмій.

Арганізацыя вытворчых майстэрань швэйнікаў

У Віцебску закончана пабудова новай швэйнай фабрыкі. Для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых сілы для фабрыкі, Наркампрацы пастанавіў адкрыць у Віцебску з пачатку новага году вытворчыя майстэрні на 120 швэйнікаў. У майстэрні будуць прымацца выключна беспрацоўныя біржы працы.

Адкрываецца гарадзкая чыгуначная станцыя

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Гарсавет пастанавіў адкрыць гарадзкую чыгуначную станцыю. У бліжэйшы час будзе прыступлена да яе абсталяваньня. Гарадзкая чыгуначная станцыя будзе прадаваць білеты, прымаць грузы з кватэр і г. д.

Зьверскае забойства з-за алімэнтаў

Полацак (наш кар.). Селяніна вёскі Струні, Полацкай акругі, Хамяка нарсуд прысудзіў плаціць алімэнты сялянцы тай-жа вёскі на ўтрыманьне дзіцяці.

Выходзячы з суду, Хамяк заявіў, што плаціць ня будзе, а сялянку, за тое, што падала ў суд, заб'е разам з дзіцянём.

Задуманы плян ён выпаўніў на другі-ж дзень. Ён спачатку забіў жанчыну, парэзаў усё цела кінжалам, а потым забіў і паўтарагадовае дзіця.

Зрабіўшы злачынства, ён на ўцёк, а спакойна чакаў арышту.

Насельніцтва вёскі, абураное злачынствам, хацела расправіцца з забойцам самасудам. Своячасовае ўмяшаньне міліцыі перашкодзіла гэтаму.

Забойца арыштаваны. На допыце Хамяк заявіў: «Я забіў—можаце мяне расстраляць».

Агляд і чыстка апарату

Сёньня пачынаецца чыстка Дзяржстраху

З дапамогай шырокіх мас працоўных праверым, вычысьцім і зробім яго больш працаздольным

Асьвяжыць Дзяржстрах!

Быў некалі вылучаны у Дзяржстрах селянін Ільюшын, але нядоўга ён працаваў у Дзяржстраху. Ня гледзячы на тое, што ён праявіў сябе як адольны працаўнік, яго чамусьці перавялі з члена праўленьня ў інспэктары, а потым... перавялі ў Магілеўскае акруговае агэнцтва, а потым... у раённае агэнцтва, дзе ён і цяпер працуе.

Вось гэта—першае «вылучэньне». Замест т. Ільюшына быў прысланы ў пачатку 1925 году селянін, член ЦВК БССР, т. Кацапаў. Яму былі прадстаўлены усе магчымасьці, каб навучыцца працаваць і кіраваць дзяржаўным страхаваньнем. Але, папаўшы ў бюракратычны апарат, ён сам трошкі абюракраціўся. Ці навучыўся ён працы, дык гэтае пад сумненьнем, бо ён часта езьдзіў усё да сябе на бацькаўшчыну «у камандзіроўку». А цяпер і яго ня стала. Яго паслалі на іншую працу.

Грамадзкіх працаўнікоў не вылучаюць

Наш апарат быў раней амаль што ў два разы большы, чымся цяпер. Вядома ўсім, што ёсьць у Дзяржстраху старэйшыя працаўнікі, якія працуюць там амаль што з самага першага дня яго заснаваньня. Але... толькі на 7 годзе працы вылучаны на пасаду канторшчыцы былы кур'ер т. Каждан. Гэтае «вялікае здарэньне» адбылося толькі пасьля некалькіх заяў, паданых ёю ў мясцком. Гэты маленькі, але яскравы факт паказвае, што справа в вылучэньнем супрацаўнікоў стаіць не на належнай вышыні.

Ёсьць працаўнікі, якія ўжо даўно актыўна, сумленна і шчыра працуюць у Дзяржстраху, але яны чамусьці не прасоўваюцца вышэй. (Гэтае самае датычыць і камсамольскага маладняку). У гэтых шчырых грамадзкіх працаўнікоў такі настрой, што мусіць яны ніколі ня будуць вылучаны на вышэйшыя пасады.

Ёсьць і другая катэгорыя службістых-падхалімаў, старых чыноўнікаў, якія зусім ня ўдзельнічаюць у грамадзкай працы калектыву, а адседжваюць 6½ гадзін і чакаюць 13 і 27 (палучкі). І вось ім рабілася перавага пры вылучэньні на вышэйшыя пасады.

Тут вінаваты і адміністрацыя, і мясцком, якія ня склалі сабе адпаведнага пляну вылучэньня працаўнікоў на вышэйшыя пасады.

Звычайна ў нас так робіцца: ёсьць вакантная пасада. Адміністрацыя высоўвае сваю кандыдатуру для замяшчэньня. Пры чым мясцком у хуткім парадку зацьвярджае гэтую кандыдатуру. Такі парадак уносіць памылкі і нездавальненьне таварышоў з тым ці іншым вылучэньнем.

На далейшы час трэба, каб уся праца па прасоўваньні і вылучэньні канцэнтравалася ў эканомкамісіі. Яна павінна адначасова з вылучэньнем адпаведных галін працы, таксама вылучыць і якасьць таго ці іншага працаўніка. Падставаю для вылучэньня альбо прасоўваньня таго ці іншага працаўніка павінны служыць ня сымпатыі да працаўніка, а рабочы стаж, адданасьць і шчырасьць у справе сьвядомага выкананьня сваіх абавязкаў, як савецкага працаўніка, колькасьць і якасьць прапаноў, унесеных даным таварышом па рацыяналізацыі і спрашчэньні сваёй непасрэднай працы, працы ўсяго апарату, у якім ён працуе, ініцыятывы, праяўленай працаўніком па зьнішчэньні бюракратычных хуліганаў і валакітны ў апараце. Акрамя таго, трэба прыняць пад увагу працу таварыша ў грамадзкіх арганізацыях. Вельмі неабходна ўлічваць службу таварыша ў Чырвонай арміі.

Эканомкамісія, улічваючы ўсе гэтыя моманты, павінна мець сталы сьпіс кандыдатаў на прасоўваньне, строга праверраных на сваёй службовай і грамадзкай працы.

Гэтым сьпісам і павінна галоўным чынам кіравацца адміністрацыя.

Шырэй дарогу адданым і сумленным грамадзкім працаўніком.

М. Р—з.

БОЛЬШ ГІБКАСЬЦІ

Ёсьць у Менску Менакрстрах—акруговае страхавое агэнцтва, якое вядзе страхавыя аперацыі таксама і па Менскім раёне.

Трэба селяніну страхоўку плаціць. Сельсавет далёка—Менск блізка, як раз кірмашовы дзень. Ох, і справу зраблю, і страхоўку заплачу.

Едзе ў Менск, ідзе ў Менакрстрах, але ня тут-то было, наварочвай назад, вязі страхоўку ў сельсавет.

На дарозе селянін сюды-туды, да сельсавету далёка і страхоўка часта доўга яшчэ не заплачана, і грошы, якія ён вёз у Акрстрах, бываюць патрачаны на іншыя патрэбы.

Такія «жорсткія» ўмовы існуюць пры зборы страхавых плацяжоў. Пад час яны вельмі цяжкія для страхавацеля.

Трэба больш гібкасьці ў абслугоўваньні сялян.

НАГЛЯДЧЫК.

Ці патрэбна у дзяржстраху праўленьне?

(У парадку абгаварэньня)

Адразу можа паказацца неяк дзіўна, як гэта Дзяржстрах будзе працаваць без праўленьня. Але калі разглядзець гэту справу бліжэй, дык тут нічога страшнага няма, калі на чале Дзяржстраху будзе не праўленьне, а кіраўнік у аднэй асобе. Якія пытаньні вырашае праўленьне? Значная частка іх—гэта зацьвярджаньне больш-менш вялікіх страхавых страт. Фактычна такія пытаньні фіксуюцца ў пратаколе без абгаварэньня, а проста для фармальнасьці. Прынцыповыя пытаньні (аб новых відах страхаваньня, акладных нормах, тарыфах і г. д.) праўленьне самастойна ня можа вырашыць, бо на гэта патрабуецца зацьвярджаньне галоўнага праўленьня, Саюзнага Наркамфіну ці ўраду. Усе іншыя пытаньні могуць вырашыцца кіраўніком установы, без праўленьня. Нават калі ўзяць такое пытаньне, як каштарыс Дзяржстраху, то ён таксама ня патрабуе разгляду на пасяджэньнях праўленьня, бо фактычна галоўным праўленьнем даюцца канкрэтныя паказаньні, як складаць каштарыс, і ён разглядаецца і ўключаецца ў каштарыс галоўнага праўленьня і зацьвярджаецца Наркамфінам Саюзу. Нават бывае, што ў галоўным праўленьні перакладаюць каштарыс пасвойму.

Такім чынам становіцца ясным, што калегіяльная сыстэма (праўленьне) для Дзяржстраху карысьці не дае.

Што дасягнута будзе, калі ліквідаваць праўленьне? Папершае, больш адказнасьці ў рабоце як кіраўніка ўстановы, так і асобных выканаўцаў (дарэчы ў Дзяржстраху функцыянальная сыстэма), падругое, не патрэбна будзе адрываць работнікаў для ўдзелу ў пасяджэньнях, якія аднімаюць адзін дзень у тыдзень, а часамі бывае 2 ці 3 дні на тыдзень; патрэціе, не патрэбна будзе рыхтаваць матар'ялы да пасяджэньняў (даклады, зьвесткі, праекты, пастановы і інш.); па-чацьвертае, пытаньні хутчэй будуць вырашацца, бо ня прыдзецца чакаць пасяджэньняў праўленьня; па-пятае, скароціцца работа па друкаваньні пратаколаў адразу на беларускай мове, а потым перакладу на расійскую мову. Нарэшце, гэта дасьць некаторую эканомію, бо фактычна трэцяму члену праўленьня вызначаны такія абмежаваныя функцыі, ад якіх карысьці няма і ня будзе.

Неяк незразумела, як гэта, у Дзяржстраху ёсьць калегія (праўленьне), ў НКФ Бел., на які ўскладзены больш адказныя функцыі, няма калегіі (тым больш, што Дзяржстрах падпарадкаваны НКФ).

Між іншым у Туркменскай, Узбекскай рэспубліках ня існуе праўленьня і ад гэтага справа не пагоршылася.

Палажэньнем аб дзяржаўным страхаваньні Наркамфіну Саюзу даецца права, па ўзгадненьні з адпаведнымі рэспублікамі, замест праўленьня вызначыць упаўнаважанага Дзяржстраху.

Гэту рэформу можна і патрэбна было-б правесьці ў жыцьцё зараз-жа, не чакаючы агульнай рэарганізацыі Дзяржстраху.

Разам з гэтым трэба спыніцца на неабходнасьці існаваньня у далейшым страхавога Савету. Бачыце, гэты Савет фармальна на паперы лічыцца пры Наркамфіне, а фактычна яго няма. Нават у Наркамфіне, за выключэньнем наркома і яго намесьніка, ніхто ня ведае аб існаваньні Савету. Складаецца Савет з 11 асоб, якія зьбіраюцца 1 раз у году на 3-4 гады. І разглядаюць пляны акладнога страхаваньня. Прадстаўніцтва ў страхавым Савеце разнастойнае, так, напр., уваходзіць членам савету упаўнаважаны НКПШ, а, як вядома, маемасьць чыгункі ніколі не страхавалася ў Дзяржстраху і страхавацца ня будзе.

Такім чынам, не вядома, каму патрэбен гэты страхавы Савет, можа для таго толькі, каб затрымаць на лішні тыдзень падачу ліку акладнога страхаваньня на зацьвярджаньне ўраду?

Х.

Куды ідуць прэміяльныя?

Кожны год Дзяржстрах за збор акладных страхавых плацяжоў аддае **тры процанты ад паступіўшых сум раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам.**

За гэты год па БССР такім чынам будзе выдана каля 155.000 рублёў, а на будучы год мяркуецца выдаць больш 153.000 руб. Па ўсяму Саюзу на гэту мэту ідзе толькі ў гэтым годзе больш пяці мільёнаў двухсот адзінаццаці тысяч рублёў.

На якія-ж мэты ідуць такія вялізарныя грашовыя сумы? Возьмем асобныя прыклады: 1) членам райвыканкому—170 руб., міліцыі, на валёнкі, набыцьцё каня—273 руб., служачым фінчасьці—110 руб. (Горацкі раён), 2) «выдаткі на землеўпарадкаваньне адказных працаўнікоў» (Бярэзінскі раён); 3) бухгальтару і касіру фінчасьці—500 руб. (Аварыцкі раён), 4) харчаваньне ўдзельнікаў пленуму РВК і г. д. Гэтыя прыклады тыповыя, яны падобны да сотні другіх. Зразумела, што некаторая частка з гэтых грошай пайшла і **на разьезды па спагнаньні страхоўкі**, але гэта невялікія сумы.

Значная частка гэтых сродкаў, ня менш палавіны, выдана членам сельсаветаў як узнагарода за збор страхоўкі. Такім чынам **асноўная маса грошай ідзе ў кішэні службовых асоб** (РВК і с.-с.), **якія атрымліваюць пэнсію і абавязаны спаганяць страхоўку**, як і падатак, паводле закону **без асобнай узнагароды.**

На наш погляд, такое зьявішча ў прынцыпе не дапушчальна. Гэта ўзнагарода прывучае да «падачак» наш дзяржаўны выбарчы апарат (РВК і с.-с.), дае падставу для злоўжываньняў гэтымі сродкамі (разьмяркаваньне ў «сямейным кругу» адказных работнікаў), прывучае нізавых работнікаў глядзець на **дзяржаўнае** страхаваньне, як на **прыватную** справу, за якую «асобная» плата, ажыцьцяўляючы гэтым ганебны капіталістычны лёзунг «не падмажыш—не паедзеш» і галоўнае, шкодна для дзяржавы і без карысьці для страхаваньня трацяцца штогод сотні тысяч рублёў, а па Саюзе—мільёны рублёў, якія так патрэбны для індустрыялізацыі краіны, для ўзьнікцця сельскай гаспадаркі.

Вывады і прапановы ўзьнікаюць самі.

Ф. КУДЗІНОВІЧ.

З лёгкай рукі юрысконсульта Бялевіча

Аб запазычанасьці былых працаўнікоў Дзяржстраху ўжо пісалася. Запазычанасьць дасягае 25.000 рублёў, але значная частка яе была сьпісана. Па якіх-жа матывах?

«Скрыўся», «месца знаходжэньня невядома»—звычайныя аргумэнты юрысконсульта **Бялевіча** для таго, каб на запазычанасьці паставіць крыж і сьпісаць яе з балянсу Дзяржстраху. Гэта Бялевічу зрабіць куды лягчэй, чым сапраўды паклапаціц

ЭСКАДРЫЛІЯ СУСЬВЕТНАЙ КАМУНЫ*)

АПАВЯДАНЬНЕ С. БУДАНЦОВА

Убанунга-га, уцякач з Мадагаскару

Прыблізна паўтара гады счакаўшы, праз два тыдні пасьля грандыёзнага пажару, які зьнішчыў некалькі буйнейшых крайдонскіх элінгаў, Аляксей Уралаў, прыехаўшы толькі што з Лёндану, сядзеў увечары ў сваім габінэце, дадыктоўваючы ў дыктафон апошнія заўтрашнія распараджэньні камэндатуры.

Сказалі, што прыбыў наведвальнік, і ў пакой увайшоў нэгр.

З аднаго погляду на яго мешкаваты, не па росьце, гарнітур Уралаў убачыў новага чалавека ў Эўропе і, значыцца, жывую вестку з Фохтбургу.

— Выбачайце, таварыш Уралаў,—сказаў нэгр на ломаній ангельскай мове.— Мяне накіравалі да вас таварышы, якія раней за мяне выбраліся з Фохтавага пекла. Маё імя Убанунга-га, я ледзь дабраўся да вас, да вас—у свабодную Эўропу,—паясьніў ён.

Убанунга-га хваляваўся.

— Якія навіны прывезьлі вы нам? —запытаў Уралаў.

— О, жудасныя!—ліхаманкава пракрычаў нэгр.—Я прыехаў паведаміць пра найвялікшую небясьпеку, якая пагражае камуністычнаму сьвету. На Эўропу спадзяюцца мае браты—нэгры-банту, зьняволеныя як ім здаецца на век...

— Ну гэта яшчэ невядома,—перабіў Уралаў,—усё-ж раскажэце мне ўсё па парадку.

Перамогшы хваляваньні, нэгр пачаў сваё доўгае, крыху няскладнае і ўсё-ж жудаснае апавяданьне.

— У апошні час я працаваў у лябараторыі прафэсара трапічнай мэдыцыны Джэмсона. Гэта лябараторыя знаходзіцца пад непасрэднай апекай Артура Рокфэлера, міністра ўзбраеньняў і мэдыка па асьвеце. Лябараторыя праводзіла масавыя досьледы над разьвяджэньнем чарвы на больш ядавітай рознавіднасьці мухі цэцэ. Досьледы ўдаліся дасканала.

Экзэмпляры атрымаліся вельмі буйныя, адным пакусам забіваюць маладога бычка. Я, як даволі навучаны і ўвайшоўшы ў поўнае давер'е нэгр, прымаў удзел у досьледзе, што рабіўся ў прысутнасьці самога рыжага Артура. Калі пасьля нядоўгай гарачкі бычок здох, міністар запляскаў у далоні і сказаў Джэмсону: «Віват, дарагі прафэсар. Сапраўды гэта варта тэлэмэханікі Канэ і Пуасона; мы яшчэ не дасягнулі магчымасьці зьнішчаць аэропляны ў Капляндзе і трансафрыканскія самалёты. Але ваша казюлька заморыць усю жывёлу ў Афрыцы, прычым ніхто і ня будзе думаць у чым тут справа». Дарагі таварыш Уралаў, вы жывеце акружаны самымі дасканалымі машынамі ня горш за нашага Фохта, у якога кажуць нават ёсьць радыёпрыёмнік эўрапейскіх дэпэш. Ці можаце вы зразумець, што такое конь і карова ў нашай адсталай краіне? Ажываючае сухазем'е абярнулася ў дзікую пустку. Як адданы служка без падазрэньняў, я быў пасланы в першай партыяй чарвы, да вадазбору ракі Лімпопо. О, я хітры нэгр, а в намі быў толькі адзін белы афіцэр, Я ніколі не забуду, як наш маторны човен, невялікі, але зроблены па прынцыпе аўстралійскай пірогі, які не баіцца навальніц Мозамбікскае пратокі, уначы вышаў сьледам за тралерам, што расчышчаў нам дарогу на водным кардоне,—так завецца наша мінная завеса. Апрача афіцэра, быў яшчэ адзін белы мэханік, рэшта былі чорныя. Гэта было зроблена для таго, каб калі мы высадзімся на бераг, на нашу экспэдыцыю не зьвярнулі ўвагі берагавыя ўлады Савецкай Афрыкі. Я пачаў растлумачваць нашай камандзе, з якім грузам і з якою мэтаю мы пакідаем востраў. Мой народ—шляхетны прынечаны народ. Каманда была абурана. Але мы баяліся застацца бяз мэханіка. На шчасьце, распрапагандаваць яго было таксама ня цяжка, ён і бяз гэтага хацеў уцячы ў Лёрэнцо Маркес, а адтуль да Мадрыду, адкуль ён родам. Мы ўтаплілі афіцэра ў вадазборы ракі Лімпопо і акіраваліся ў Порт-Наталь. Калі Капскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт даведаўся пра нашу учынак, а я неадкладна паказаў досьлед з маладым бычком і нашай мухай, то тутэйшае насельніцтва занепакоілася. Нельга было марудзіць ні хвіліны. Была праведзена мабілізацыя, каб узмацніць берагавую варту. Але-ж стары пірат Фохт спраўляўся і не з такімі сіламі. Ён можа пайсьці на ўсё. У яго ёсьць вельмі моцныя браняносцы і падводны флёт. Капская рэспубліка бяз зброі. Мяне накіравалі з мандатам у Лёндан, і сюды я прыехаў в старшынёю Капскага ЦВК, яшчэ не пасьпеўшы вайсьці ў Вэстмінстэр, я накіраваўся да вас.

— Я вельмі ўдзячны вам за давер'е, таварыш Убанунга-Га,—сказаў Уралаў. —Маю надзею, што апрацаваў яго. Вы маеце рацыю, нельга марнаваць ні хвіліны.

І падышоўшы да тэлефону, ён распарадзіўся:

— Прашу падаць мой апарат В-1-4. Лётнік Андэрсэн, мэханік Суфу. Мы едзем у Лёндан, дарагі таварыш,—сказаў Уралаў, вешаючы трубку.

Лёнданскі друк жвава прыняў уцекачоў з лягеру контр-рэвалюцыі. Іх біяграфія, іх інтэрв'ю пашыраліся Кантынэнтальным агэнцтвам і Трансакіянскім радыё-паведаміцелям. Тоўстагубыя, усьмешлівыя твары зьязялі в усіх газэт пад істужкамі лёзунгаў.

«Мы павінны выратаваць Чырвоную Афрыку ад ката Фохта».

«Пралетар, вымі з похвы апошні раз свой караючы меч».

«Пара пакончыць в чужаедамі, якія ашалелі».

Артыкул за подпісам Уралава ў «Брытанскім Камунісьце» канчаўся яшчэ больш энэргічна:

«Мы папярэджвалі ў свой час камуністых усяго сьвету аб небясьпецы зачумленага востраву. Разьюшаная фантазія белых дэспатаў, ашалелых пад трапічным сонцам, якія так заахвочваюць рабаўладаньне, шукае крывавага ажыцьцяўленьня. Зноў пракрычым стары воклічь: «Да сьцянкі».

Дасьцінных фэльетаністых вячэрніх газэт вабіла наступная падрабязнасьць аднаго інтэрв'ю з Убанунга-Га для кітайскай газэты:

«Нашы гэройскія гаспадары зусім не клапоцяцца аб будучым пакаленьні. Адным в старэйшых на востраве прамысловых прадпрыемстваў, фактычным галавой якога стаіць сам Мусаліні,—а гэта паказвае, што справа прыбыткова, а пацьвярдзіцца фабрыка гумавых вырабаў—«Новы Рамзэс». За чатыры гады нарадзілася толькі няць белых дзяцей, затое мулаты плодзяцца ў нязвычайнай колькасьці.

«На фабрыцы працуе 500 чалавек па дванаццаць гадзін у суткі, а на востраве-ж белых і жоўтых спажыўцоў прадукцыі ўсяго толькі некалькі дзесяткаў чалавек.

«Вы ўяўляеце такое пашырэньне ўнутранога рынку, бо экспорту-ж у нас няма».

Стары Гасье, выдатны парыскі карыкатурысты і вэтэран рэвалюцыі яшчэ раз паспрабаваў свой няпрытуплены аловак на знаёмай фізіяноміі Мусаліні ў такой сьмелай карыкатуры, што заўсёды наравістыя ангельскія газэты не адважваліся яе перадрукаваць.

Але парыжане рагаталі два дні.

Паход

Уралаў ня чытаў у тыя дні газэт. Ён горача выступаў і ў Вэстмінстэры (будынак ураду), і ў рабочых кварталах Лёндану, і на кройданскім аэрадроме, агітуючы, каб хутчэй выступіць супроць контррэвалюцыі. Яго голас чуцён быў праз радыё ва ўсім сьвеце. Яго кватэра ў Грынвічы абярнулася ў склад спачувальных радыё-дэпэш з усіх канцоў сьвету. Амэрыка выслала 240 буйнейшых самалётаў тыпу В-9-4, Японія і Кітай пыталіся, колькі дырыжабляў патрэбна для абслугоўваньня тылу экспэдыцыі.

Нямецка-французкае аб'яднанае морскае ведамства ўжо накіравала дрэдноты і субмарыны, якія ўпяршыню за чатыры гады вышлі ў такі далёкі рэйс, у Порт-Наталь.

У Расіі Галоўнаветрафлёт павінен быў спыніць прыём добраахвотнікаў ва ўралаўскую экспэдыцыю, баючыся ўрэшце за рэгулярную работу ўласнага паветранага транспарту.

Ведаючы аб існаваньні пікрынолавых паветраных мін Бітэрфорда, Уралаў дабіваўся прыстасаваньня самалётаў да большай трываласьці.

Дзесяткі вынаходцаў і канструктараў працавалі на ўсіх авіязаводах Брытаніі і Францыі. Трапіць у паветраны цыліндр Бітэрфорда было вялікай няпрыемнасьцю нават для мадэляй В-4, устойлівасьць якіх у «мірных» абставінах гуранганў над Паўднёвай Амэрыкай была ідэальнай.

Ямы Бітэрфорда былі небясьпечны ў асаблівасьці для малых самалётаў (на 15 пасажыраў) выведчай службы і для «стрекоз» службы сувязі.

Гэтыя апошнія, між іншым, на вялікі жаль Уралава, не маглі прыняць масавага ўдзелу ў будучай бойцы, бо ня было магчымасьці паставіць на іх цяжкія электраводы і тэлеакумулятары, прызначаныя супроць волі Пуасона, бяз страты «стрекоз» патрэбнай шпаркасьці ў 700-800 кілёмэтраў.

14-га мая 1944 году, а шостай гадзіне па лёнданскі часе, эскадрылія сусьветнай камуны зьнялася з крайдонскага аэрадрому.

Спераду ішлі два выведчыкі А-1-1, за імі штабны самалёт Уралава В-4 біс, акружаны атрадам з сарака амэрыканскіх апаратаў і дванаццаці «стрекоз».

Галоўная маса зьнішчыцеляў ішла в інтэрвалам у дзесяць кілёмэтраў, уся эскадрылія замыкалася япона-кітайскім дырыжабельным абозам. Пяцьсот сем дзесят машын бушавалі ў паветры.

Нават бачыўшы віды ў часе сьвят сусьветнай рэвалюцыі (7-га лістапада) звычайна спакойныя лёнданцы, і ты в бойкаю займалі месцы ў пасажырскіх самалётах, уліпаючы бінокляміі ў дзюр алюміневыя згусткі магутнасьці сьвету.

Дырыжабль ураду нярухома стаяў над Вэстмінстэрам, і члены сусьветнай СНК, не адрываючыся, глядзелі на ўсход, дзе ішла флётылія, пурпуравая ў праменях заходу.

Пятнаццаць тысяч адважнейшых салдат рэвалюцыі адплывалі на поўдзень. Тысячы пудоў інтрытолу, дымавых гранат, соннага газу, атрутных мэталіёдаў пасылаў разгневаны пралетарыят Мадагаскару.

Калі параўняліся з Лёнданам, вялізарныя рупоры параходных радыё-фонаў, адбіваючы магутныя гукі аркестру Брытанскай камуністычнай рэспублікі загрымелі «Інтэрнацыяналам». І каюты самалётаў у адказ загрымелі, на другой хвалі, рознамоўным «ура» сусьветнаму гораду, сталіцы зямлі.

Гэтае вялікае прывітаньне было электрычна сфонаграфавана, каб яшчэ раз грозна прагучэць над агідным востравам чужаедаў.

Вэтэраны 1918-21 г. г., расійскія чырвонаармейцы, таварышы Уралава абцералі сьлязу, што перашкаджала глядзець на туманны гіганцкі горад.

Бедны Убанунга-Га ўсхліпваў.

— Ну, расчуліўся гарачы чалавек,—сказаў Уралаў парасійску, і, павярнуўшыся да штабных, заўважыў, перайшоўшы на ангельскую мову:

— Пара за работу брацца, таварышы!

*) Працяг, пачатак глядзі ў нумары 150.

„Зьвязда" дапамагла

ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ

Па допісу, дасланаму на расьсьледваньне рэд. газ. «Зьвязда» аб кантралёру Мазырскай акруговай ашчадкасы Юркевічу, які нядбайна адносіўся да працы, скарыстоўваў камандыроўкі для паездкі да сваякоў,—факты пацьвердзіліся. Юркевічу абвешчана вымова і ў сучасны момант ён з работы зьняты.

СПРАВА ПЕРАДАНА СУДУ

Мазырская пракуратура скончыла сьледзтва аб падпале сена ў аб'ездчыка Мухаедаўскага лясьніцтва. Устаноўлена, што падпал зрабіў гр-н хут. Хільчына Гаўрук Васіль з мэтай помсты за складаньне пратаколу за парубку лесу і патравы сенажаці. Справа пакірована Мазырскаму акруговаму суду для прыцягненьня да адказнасьці.

ТАКІМ НЯ МЕСЦА Ў КАМСАМОЛЕ

Пацьвердзіліся факты дасланай заметкі рэд. газ. «Зьвязда» для расьсьледваньня аб ненармальных зьявішчах у Лельчыцкай сямігодцы, дзе вучні-камсамольцы Кавальчык К. В., Кебец Т. і Варановіч А. хуліганілі і вядзекваліся над дзяўчынкамі гэтай сямігодкі ў часе культпаходу ў в. Дуброву. Лельчыцкі РК КСМ выключыў з радоў КСМ Кавальчыка, Кебеца і Варановіча. Адначасова ўзбуджана хадайніцтва перад належнымі органамі аб вываздзе іх з кіруючага складу школы, што ўжо зроблена. Піянэры, якія таксама ў часе культпаходу хуліганілі і вядзекваліся над піянэркамі, ўжо выключаны з радоў піянэраў.

ВЫКЛЮЧАНЫ З ЛІКУ СТУДЭНТАЎ

Аршанская акруговая пракуратура паведаміла на надрукаваную заметку ў № 94 газ. «Зьвязда» пад назвай «Чужыя ў Мсьціслаўскім пэдтэхнікуме», што наступныя студэнты: Пушніна Вера, Пушкін Павел, Яноўская Кіра, Яноўская Ларыса, Супонава Марыля, Шчарбенкова Агапа, Кузьмянкова Лідзія, Рудніцкая Вольга, Рудзянская Гіся, Райхлін Майсей, Касьценіч Янка, Кавалёва Раіса, Кавалёў Васіль і Анташкевіч Тайба—па выяўленьні тэхнікумам іх сацыяльнага становішча былі выключаны з ліку студэнтаў Мсьціслаўскага пэдтэхнікуму. Рудніцкая Вольга, Будзянская Гіся, Касьніч Янка, Кавалёва Раіса і Анташкевіч Тайба, якія былі тэхнікумам выключаны, паводле пастановы калегіі Наркамасьветы БССР у правох студэнтаў адноўлены.

ПРЫНЯТЫ РАШУЧЫЯ МЕРЫ

У свой час была дасланая заметка рэд. «Зьвязда» пад назвай «Як праўленцы ЖАКТ'у № 8 растрачваюць народныя грошы» у Менскую АКК РСІ на расьсьледваньне. Сьледствам у асноўным факты пацьвердзіліся. За безгаспадарчасьць у дзейнасьці ЖАКТ'у, несваячасовы выкуп вэксалёў, запазычанасьць па кватэрнай плаце на 7.000 руб., за невыкананьне пастаноў аб перадачы матар'ялу ў пракуратуру за растрату 134 руб. у чым вінавата праўленьне ўцалку, а таксама загадчык дамамі—Андронаў, за што апошні з працы зьняты, а праўленьню абвешчана вымова. Прапанавана зараз-жа прыняць рашучыя меры да зьнішчэньня гэтых недахопаў.

АЗДАРАЎЛЕНЬНЕ ЛЮБАНІЦКАГА ВУЧАСТКУ ЛЕСБЕЛУ

Дасланы рэд. «Зьвязды» на расьсьледваньне допіс аб Любаніцкім вучастку Лесбелу, дзе знайшлі сабе месца розныя чужыя элемэнты, як былы ўласьнік і падсудны заг. вучастку Каплан, які стараўся падарваць аўтарытэт дзесятніка Іофе, а таксама мясцовых партыйных і грамадзкіх арганізацый,—пацьвердзіўся. Пастановай Бабр. АКК-РСІ з працы зьняты Каплан, ст. дзесятнік Шэйн, былы валютчык і леспрамыслоўца, дзесятнік Русецкі, кулак, пазбаўлены выбарчых правоў, дзесятнік Белкін, як былы ўласьнік і падсудны.

За культурную кіно-рэкляму

Добры пачын Белдзяржкіно

Белдзяржкіно, сумесна з рэдакцыяй газэты «Беларуская Вёска», выпусьціла натурна - мульціплікацыйны рэклямны фільм «Газэта, калгас і падпісчык Тарас». У гэтым фільме рэжысэр абмінуў звычайныя шаблённыя прыёмы кінорэклямы.

Замест таго, каб псаваць кінастужку на ўсякія «кунштукі», якія нічога не даюць ні разуму, ні пачуцьцю, якія на маюць ніякай культурнай вартасьці (розныя чалявечкі, бегаючыя літары і г. д.), Белдзяржкіно змагло выпусьціць рэклямны фільм, які разам з тым зьяўляецца і добрым маленькім культурфільмам.

Зьмест фільму наступны: бядняк-селянін Тарас зацікаўлены, чаму гэта ў яго дрэнная гаспадарка, а ў калгасе добрая. Ён зьвяртаецца да калгасьніка, які тлумачыць яму, што трэба выпісаць газэту. Там ён зможа знайсьці розныя карысныя парады аб тым, як трэба весьці гаспадарку. Тарас адпраўляецца ў горад, дзе і падпісваецца на газэту.

На фоне гэтага прымітыўнага зьместу рэжысэр змог добра паказаць тэй багаты матар'ял, які ёсьць у нашых калгасах, Апэратарская апрацоўка гэтага матар'ялу зроблена добра. Шмат выігрывае фільм і ад жывых надпісаў, якія зроблены паэтою Крапівою.

Зрабіў фільм рэжысэр-мульціплікатар А. Найдзіч. Апэратар А. Кальцаты. Д.

СУД

Справа былога старшыні Клічаўскага РВК

У ліпені і жніўні мінулага году ў нашай газэце былі зьмешчаны артыкулы пра непарадкі і злачынствы ў Клічаўскім РВК, Бабруйскай акрузі. Пачалося сьледзтва, якое прывяло райвыканкомаў цаў на лаўку падсудных.

19-20 чэрвеня г.г. Бабруйскі акруговы суд устанавіў: у 1927-28 г. старшыня Клічаўскага РВК Паўла Русіновіч прадаў свайму швагру, Асоўскаму сад у б. маёнтку Ганаратава і гэтым зрабіў шкоду жыўшым там батраком і беднаце; Русіновіч дапусьціў, каб уцёкпы ў Польшчу бандыт Татура Антось, прадаў дом яго швагру, кулаку Татуру Ігнату, а жыўшым у доме бедняком Русіновіч сам асабіста прапанаваў высяліцца ў 8-дзённы тэрмін. Бяднячка Міраповіч вымушана была в чацьвярыма дзецьмі, з хворым на сухоты мужам перабрацца ў хлеў з дзіраваю страхою, дзе жыла да восені і дзе не муж і памёр.

Русіновіч здаваў заказы на школьнае абсталяваньне свайму швагру, кулаку Татуру Ігнату, пераважна перад калектывам кваліфікаваных сталяроў.

Такім чынам, Русіновіч, як старшыня РВК, сваімі дзеяньнямі скажаў клясавую лінію, трымаў сувязь з кулаком, чым падрываў аўтарытэт савецкай улады і выклікаў справядлівае нездаваленьне беднаты.

Былога члена прэзыдыуму РВК Мількоўіча Аўгена суд знайшоў вінаватым у тым, што ён, ведаючы аб вышэйпаказаных учынках Русіновіча, скрываў іх і нідзе на іх не рэагаваў.

Суд прыгаварыў Русіновіча да пазбаўленьня волі на тры гады, а Мількоўіча на адзін год.

Па амністыі абодвым асуджаным зьняволеньне скарочана на палову.

9 ліпеня Вярхоўны суд, праверыўшы ўсе матар'ялы па гэтай справе, прыгавор адносна Русіновіча зацьвердзіў, а адносна Мількоўіча адмяніў і справу аб ім спыніў.

Ад камісіі па чыстцы апарату НКЮ

Чыстка апарату НКЮ будзе праводзіцца 18-га ліпеня, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дома Селяніна. Запрашаюцца працоўныя г. Менску для ўдзелу ў чыстцы.

Вялікі пажар у в. Каралішкавічы

14 ліпеня ў вечары, у вёсцы Каралішкавічы, за 15 вёрст ад Менску здарыўся пажар, які ахапіў адразу некалькі будынкаў. На пажар акрамя сельскіх пажарных дружын выехала Менская пажарная каманда. Пажарнай камандзе ўдалося на працягу 1½ гадзін ліквідаваць пажар. Усяго згарэла 16 двароў з пабудовамі.

Правілы прыёму

ў завочную ўсебеларускую саўпартшколу II ступені імя Ф. Дзяржынскага

1. Усебеларуская завочная саўпартшкола II-й ступені ставіць сваёй мэтай сярэднюю палітычную адукацыю партыйнаму, камсамольскаму і беспартыйнаму савецкаму і прафэсіянальнаму актыву, не адрываючы яго ад непасрэднай грамадзкай і вытворчай працы.

2. У склад курсантаў прымаюцца:

а) асобы, якія маюць партыйны стаж і ўдзельнічалі ў грамадзкай працы ня менш 1 году;

б) члены ЛКСМБ, якія вядуць актыўную грамадзкую працу ня ніжэй раённага маштабу, з камсамольскім стажам ня менш 2-х гадоў;

в) беспартыйны савецкі і прафэсіянальны актыў раённага маштабу з 2-х гадовым стажам грамадзкай працы.

Увага: беспартыйныя павінны мець хадайніцтва РК партыі, ці парт'ячэйкі.

г) паступаючыя павінны мець: 1) палітычную падрыхтоўку ня ніжэй адзінай школы палітграматы і быць знаёмы з рашэньнямі XV-га партзьезду і XVI-й партканфэрэнцыі ВсеКП(б) і XII-га зьезду КП(б)Б, 2) агульна-адукацыйныя веды—умець добра чытаць, пісаць і выкладаць свае думкі на паперы, рабіць арытмэтычныя дзеяньні з лічбамі і дробамі.

3. Праграма заняткаў у завочнай школе ў асноўным тая-ж, што і ў асноўнай Усебеларускай саўпартшколе II-й ступені імя Ф. Дзяржынскага, за выключэньнем агульна - адукацыйных дысцыплін, якія праходзяцца па скарочанай праграме. Праграма разьлічана на 3 гады. Для жадаючых дазваляецца вывучэньне асобных дысцыплін па асабістым выбары.

4. Заняткі праводзяцца шляхам самастойнай працы па заданьнях і мэтадычных указаньнях школы. Кіраўніцтва працаю завочнікаў вядзецца праз рэцэнзіі па пісьмовых заданьнях, вусныя кансультацыі і кароткатэрміновыя канфэрэнцыі па асобных акругах, якія адбываюцца ў працягу навуч. году, а таксама падагульняючыя канфэрэнцыі курсы пры школе.

5. У школу будзе набрана 200 асоб, якія разьмяркоўваюцца па акругах. Набор курсантаў праводзіцца з 15 ліпеня па 1 верасьня.

6. Заявы аб паступленьні ва Усебеларускую завочную саўпартшколу II-й ступені, разам з анкетамі, жыцьцяпісам які завяраецца райкомам партыі, для беспартыйнага актыву прафэсіянальнай, ці савецкай арганізацыяй, накіроўваюцца ў АПА акругкому партыі, дзе будуць вылучаны кандыдаты. Залічэньне ў школу праводзіцца спэцыяльнай камісіяй, якая ўтвараецца пры школе.

7. Умовы працы наступныя: навучаньне, патрэбныя падручнікі, арганізацыйныя, канцылярскія выдаткі і паштовая перапіска праводзяцца за кошт школы.

8. Больш падрабязныя весткі абумовах працы можна высьветліць дасылкай лістоў па адрасу: Гомель, Усебеларуская завочная саўпартшкола II-й ступені імя Дзяржынскага.

9. Разьмеркаваньне месц па акругах:

Аршанская	20
Бабруйская	25
Віцебская	30
Гомельская	30
Магілёўская	25
Менская	30
Мазырская	20
Полацкая	20

Загадчык АПА ЦК КП(б)Б Стасевіч.
Загадчык УСПШ Агульнін.
Загадчык УЗОПШ Мэльцэр.

Паведамленьні

— АПА Менакругкому КП(б)Б 18-га ліпеня, а 12 г. дня склікае нараду па пытаньні радыёфікацыі акругі, на якую запрашаюцца наступныя таварышы: Купцавіч—радыёцэнтр, Шыманскі—акрпалітасьвет; Замыка—ЦП працземлесу; Дыла—Белкаапсаюз; Маслоўскі—АК ЛКСМБ; Табайнік—культадзел ЦСПСБ; Альяровіч—МЦРК і прадстаўнікі Дзяржшвэймашыны, Менаддзяленьня сувязі і акруговай калгасэкцыі.

Яука абавязкова.

— 19-VII, а 7 г. ув., у залі пасяджэньня ЦСПСБ адбудзецца нарада па правядзеньні Усебеларускага піянэрскага зьлёту. Менакругком КП(б)Б на гэту нараду запрашае наступных сакратароў ячэек КП(б)Б: яч. зав. «Камунар», «Бальшавік», чыгуначнага вузла, Эльвод, 1-й Дзярждругкарні, шпалорнай ф-кі, Меншвэю, МЦРК, банкаўскіх устаноў, заводы «Энэргія», «Чырвоная Зара», гута «Пралетары», шчотачнай ф-кі, будаўнікоў Універсытэцкага гарадка, хлебазаводу, заводу «Беларусь», сьпіртзаводу.

Яука сакратара, альбо апорга ячэйкі абавязкова.

— Жанаддзел Кастрычнікавага райкому КП(б)Б паведамляе, што ў пятніцу, 19-га ліпеня, а 6 г. ув., у памяшканьні РК склікаецца нарада жапоргаў з наступнай абвесткай дня:

1. Аб міжнародным чырвоным дні.

2. Выніхі перавыбараў упаўнаважаных па падпісцы на часопіс «Работніца і Сялянка».

— Сад нархарч. Сёньня, 17 ліпеня а 7 гадз. увечары адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б нархарч. Запрашаюцца ўсе рабочыя і хатнія прадаўніцы.

— Сад Асьветы. Сёньня—кіно, замежны фільм «Пробуждение женщины». Пачатак а 10 гадз.

— Саюз будаўнікоў арганізуе ў чацьвер 18 ліпеня культ-паход членаў саюзу будаўнікоў у дзярцырк. Білеты па зьніжаных цэнах па рабачкомах.

— Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Кастрычнікавым Райкомам КП(б)Б аб Міжнародным Чырвоным Дні (1-га жніўня): Гантман, Палякоўскі, Страноўскі, Ашаровіч, Васілевіч, Хлебнікаў, Конанаў, Галядзед, Цёмкін, Юргенсон, Дорохаў, Аверын, Ісаў, Рудзіцкі, Белько, Карась, Кілос, Пучкоў, Уольпенскі, Лапатка, Кірушын, Рыўлін, Стасевіч, Славінскі, Левін, Ягідовіч, Гохман, Міхайлаў, Нароенка, Кейлін, Некрашэвіч, Крэмер, Каменштэйн, Гольдзін, Брыскін, Гольмшток, Чарнаўскі, Вайсманбойнікаў, Матусэвіч, Розэнгаўз, Яршоў, Подольскі, Лазоўскі, Жукаў, Ракаў, Міхайлаў, Шапіра, Якаўлеў (ДПУ), Папенкаў і Прахарэнка.

Заг. АПА РК КП(б)Б ЛЕВІН.

— У сераду, 17-га ліпеня, роўна а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні акругкому МОПР'у, Савецкая, 87, адбудзецца пленум Фрунзаўскага райкому МОПР'у з наступным парадкам дня:

1. Падрыхтоўка пляну—1-га жніўня.

2. Выніхі кампаніі дапамогі нямецкіх рабочым. Запрашаюцца члены пленуму і актыў МОПР'у.

Фрунзаўскі райком МОПР'у.

— Усім кіраўнікам партгуртко'ў па вывучэньні пытаньняў XVI-й партканфэрэнцыі прапануецца ў абавязковым парадку адзін раз у тыдзень наведваць агітпроп, габінэт (пры клюбе К. Маркса), дзе будуць давацца ўказаньні, як вясьці прапрацоўку.

Габінэт адчынены з 6 да 11 гадз. увечары штодзённа за выключэньнем аўторку. ФРУНЗАЎСКІ РК КП(б)Б.

— У чацьвер, 18-VII—29 г., а 6 гадз. увечары ў памяшканьні ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б адбудзецца НАРАДА ЖАНАРГАНІЗАТАРАЎ Фрунзаўскага раёну.

У парадку дня:

1. Бягучыя задачы жанарганізатараў.

2. Аб Чырвоным Дні.

3. Аб росьце партыі за ліп работніц (інфармацыі з месц аб выніках).

— Сёньня, 17 ліпеня, а 6-й гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў АК КП(б)Б адбудзецца нарада ўсіх таварышоў, якія былі, па пастанове АК, мабілізаваны для працы на вёсну.

МЕНАКРУГКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР І МУЗЫКА

Пачынаюцца гастролі музычнай камэдыі

Сёньня, 17 ліпеня, пачынаюцца гастролі музычнай камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева.

Ідзе папулярная музкамэдыя «Роза-Мары», якая ніколі яшчэ ня ставілася ў Менску.

Гастролі Беларускага рабочага тэатру

З 22 чэрвеня па 6 ліпеня калектыў Беларускага рабочага тэатру да спэктаклі ў Смалявічах, Барысаве, Крупках, Бабры, Слаўным, Талачыне і Кохановае.

У Крупках, Бабры, Смалявічах і Талачыне былі арганізаваны калектыўныя паходы ў тэатр рабочых з заводаў, камсамольскіх калектываў і піянэрскіх атрадаў.

Усе ўдзельнікі калектыўнага наведваньня тэатру карысталіся скідкаю ў разьмеры 10 проц.

У Талачыне быў даны спэктакль на карысьць савету сацыяльнае забясьпекі.

За два тыдні дана 16 спэктакляў і абслужана 3½ тысячы насельнікаў.

ВЫШАЎ з ДРУКУ і паступіў у продаж

„ЛІПНЁВЫ ГІМН"

Словы Ул. Дубоўкі. Музыка Мік. Равенскага.

Выданьне газэты «ЗЬВЯЗДА».

Цана 15 кап.

Прадаецца ва ўсіх магазынах Белдзяржвыдавецтва.

Заказы накіроўваць у галоўную кантору газэты «Зьвязда» —Менск, Савецкая, 63.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Новы мастацкі баявік МАТРОС ГАЛАЙ у 6 частках. Пачатак сэансу роўна а 8 гадзіне. Каса—ад 6 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — 2 мастацкіх фільмы ў адзін сэанс 2. 1. Тры пакоі з кухняю. 2. ПА КОНГО. Пачатак сэансаў а 9 г. 15 м. Каса—ад 7 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Новы фільм, вытворчасьці ВУФКУ. Млын паўскрай лесу, драма ў 6 част. Звыш праграмы: Кіно-хроніка Савкіно № 28. Пачатак ад 7 з пал. г. Каса—ад 5 з пал. г.

КІНО Пралетары — 2 баявікі ў адзін сэанс 2. 1. Ігар Ільінскі ў фільме ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ. 2. Гарольд Лёйд ў фільме МАРАК. Пачатак—а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Спартак — Грандыёзны замежны фільм „БЛАНШЭТ", драма ў 7 частках. Каса адкрыта ад 6 гадз. Пачатак а 7½ гадзіне ўвечары.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. АДКРЫЦЬЦЕ ГАСТРОЛЯЙ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ І КАМОПЭРЫ. Сёньня, 17-га і заўтра, 18 ліпеня — 1-ы РАЗ у МЕНСКУ. РОЗ-МАРИ музкамэдыя ў 3-х дз. і 9 абразох, расійскі пераклад Феона. —) Новыя дэкарацыі афармл. мастака Л. Леанідава (—. ПЯТНІЦА, 19 ЛІПЕНЯ — ПАПУЛЯРНАЯ МУЗКАМЭДЫЯ. ЖРЫЦА ОГНЯ у 3-х дз. Білеты ў касе тэатру ад 12—2 ч. і ад 5 ч. дня і ў раб. касе ад 12—2-х ч. і ад 4—6 ч. увечары. Падрабязнасьці ў афішах. Дырэкцыя

АДКРЫТ ПРЫЕМ ПАДПІСКІ на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90 к., на 3 м.—2 р. 60 к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.

«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісы

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крэсьцянскі КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, ня упоўнаважанымі, адз. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.

Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", адз. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.

З мэтай эканоміі газэтнай паперы, камплекты газэты „Зьвязда" будуць друкавацца за першыя чысла кожнага месяцу ў самай абмежаванай колькасьці.

Таму гал. кантора газ. „Зьвязда" просіць усіх падпісчыкаў здаваць падпіску да 28-га чысла. Па заказах, якія паступяць у гал. кантору несваячасова, к-ра не гарантуе высылкі газэты камплектам за першыя чысла, а толькі са дня паступленьня заказу.

Каб забясьпечыць атрыманьне першых нумароў «Зьвязды» за жнівень, просьба падпісацца загадзя, не пазьней 27—29 ліпеня.

СЁНЬНЯ серада 17 ліпеня — ДЗЯРЖЦЫРК | АПОШНІЯ 5 ДЗЁН. Гастролі Маскоўск. Дзяржаўн. цырку. ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ УСЕ АРТЫСТЫЯ ЦЫРКУ. Гастролі УЛАДЗІМЕРА ДУРАВА (Малодшага). Толькі 2 дні САБАЧАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ Толькі 2 дні. пантаміма ў выкананьні жывёлін, у 2-х актах, спэцыяльныя дэкарацыі. А таксама неадменнае выступленьне любімцаў публікі Морскіх львоў, сланя Маркса і інш. жывёлін. З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІЗАРНАЙ ПРАГРАМЫ —) ПАЧАТАК РОЎНА А 9 ГАЗ. УВЕЧ. (—

РВА ЦСПСБ. Вышла з друку і паступіла ў продаж кніга В. П. СУШЧЫНСКАГА (юрысконсульта ЦСПСБ) „Законадаўства аб працы СССР і БССР". Стар. 349; цана у пераплёце—3 руб. Прадаецца ў РВА ЦСПСБ (Менск, Дом Працы) і ва ўсіх кнігарнях БССР.

МУЖ ЖЕНЕ — должен приобрести, если хочет с'экономить ДЕНЬГИ и иметь вкусно приготовленную пищу, паст. поварен. книгу Анина. Раст., молочн. стол. Меню 500 разн. питат. вегетар. и диетич. блюд (завтраки, обеды, ужины, дессерты, печенье и пр.). Цена 1 р. 50 к., в перепл. 1 р. 75 к. Высыл. налож. плат. Москва, Политехнический музей, 110, „К